ЯН ПЯТРОЎСКІ

КЛЯСЫЧНЫ

ГРЭЦКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

==================

ЧАСТКА ДРУГАЯ

==================

Літары: Ν ν – Ω ω

1985

ЯН ПЯТРОЎСКІ

ГРЭЦКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

2

ν–Ωω

ЯН ПЯТРОЎСКІ

***

КЛЯСЫЧНЫ

ГРЭЦКА-БЕЛАРУСКІ СЛОЎНІК

НАНАВА АПРАЦАВАНЫ

=================
ЧАСТКА ДРУГАЯ
=================

Літары: N ν – Ω ω

Published by The Byelorussian Charitable Educational Fund, Inc.
Printed in The United States of America

-- • --

1985

З прычыны ўзаемнае залежнасьці думкі і слова, тут ляжыць довад, што мовы не зьяўляюцца фактычна сродкамі рэпрэзэнтацыі праўды, якая ўжо запэўнілася, але значна болей – сродкамі выкрываючымі праўду, няведамую дагэтуль. Іхная розьніца не зьяўляецца розьніцаю гукаў, але розьніцаю сьветапаглядаў.

Вільгэльм Гумбольдт

СКАРОЧАНЬНІ

а. – або
абазн. – абазначаны
абум. нязьм. часьц. – абумоўленая нязьменная часьцінка
адзін. л. – адзіночнага ліку
адн. – адносны займеньнік
азбр. – азброены
анат. – анатомія
анг. – у ангельскай мове
арам. – арамэйская мова
арт. – артысты; артыкул
ас. і асоб. – асоба
асабл. – асабліва
Ат. – Атэны.
атт. – хворма аттыцкага дыялекту
астр. – астраномія
б. – бог, багіня
бел. – беларускі.
буд. ч. – будучы час
Бэот. – Бэоцыя
в. – вайна
ваен. – ваенны
він. скл. – вінавальны склон
выш. ступ. – вышэйшая ступеня
ґімн. – ґімнастычны
ґэом. – ґэомэтрыя
гр. – граматычны; грэцкі
грам. – граматыка
гэаґр. – гэаґрафічны назоў
гэбр. – гэбрайскі
дав. скл. – давальны склон
дадз. – дадзены
дасл. – даслоўна
дзеясл. – дзеяслоўны прыметнік
дор. – хворма дорыйскага дыялекту
Д. сьв. ап. – Дзеяньні сьв апосталаў
жан. – жанчына; жаночы род
жарт. – жартоўна
жаў. – жаўнер
ж. р. – жаночы род
заг. л. – загадны лад
займ. – займеньнік
зам. – замест
зах. – заходні
зв. – званы
звар. займ. – зваротны займеньнік
злуч. – злучнік
іён. – хворма іёнскага дыялекту
імя ўл. – імя ўласнае
ін. – іншы
інф. – інфінітыў
іт. – італьянскі
к. – кедравы
кам. – каменны
кл. – кілёмэтар
кліч. скл. – клічны склон
к.-н. – каго-небудзь
кр. – красіс /κρᾶσις/
лац. – лацінскі
лінґ. – лінґвістыка
літ. – літаратурны
Лякон. – Ляконія
м. – места
М. А. – Марк Аўрэліюс
мар. – маральны
месц. – месца
міт – міталягічны
мн. л. – множны лік
мовазн. – мовазнаўства
муж. – мужынскі род
мэд. – мэдыцына
мэтал. – мэталёвы
мэтаф. – мэтафорычны
н. – нехта, нейкі, нешта
наз. назоўнік = прадметнік
наст. – наступны
неакр. – неакрэсьлены
неас. – неасабовы
Н. З. – Новы Запавет
ніяк. род – ніякі род
новатв. новатвор
нязьм. часьц. – нязьменная часьцінка
ням. – у нямецкай мове

п. паводля; птушка
паказ. займ. – паказальнае займеньне
паменш. – паменшальны
пар. – параўнальна
Парм. – "Пармэнідэс"
пас. хв. – пасыўная хворма
паэт.– паэтычны
пер. – пераважна
перш. асоб. – першая асоба
п.н.э. – перад нашаю эраю
роз. грэц. – позна-грэцкае
прав. – праваслаўны
прадм. – прадметнік
прым. – прыметнік
прым. пыт. – прыметнік у сэнсе пытаньня
прын. займ. прыналежны займеньнік
прыназ. – прыназоўнік
прысл. – прыслоўе
пыт. – пытальны
р. – радзіўся
рэліг. – лэлігійны
с. – самога
сакр. – сакральны
скар. – скарот
скл. – склон
ст. – стары; старажытны
ступ. пар. – ступень параўнаньня
супроць. – супроцьлежнасьць
супроцьст. – супроцьстаўленьне
суф. – суфікс
сьцісн. – сьціснуты
у гір. сэн. – у гіранічным сэнсе
у грам. – у граматыцы
у зн. – у значэньні
у зн. пер. – у значэньні пераносным
ускл. – усклік
хв. – хворма
хр. – хрысьціянства, хрысьціянскі
царк. – царкоўны
цяпер. ч. – цяперашні час
ч. – чалавек
ч. прош. – час прошлы дакананы
часьц. – часьцінка
ш.-н. – што-небудзь
энкл. энклітычны
эп. – грэцкая эпічная літаратура
эпіт. – эпітэт

N

N, ν, νῦ, ну, трынаццатая літара грэцкае абэцэды.
ν' як лік = 50; але ͵ν = 50.000.
ναέτης, ου, ὁ, паэт. сусед.
ναετήρ, ῆρος, ὁ, асяленец, жыхар.
Ναζαρηνός, ὁ, назарэнец, жыхар Назарэту.
ναί, так, гэтак, але, ага.
Ναΐς, άδος, ἡ, перав. мн. л., Ναΐδες, Наіады, водныя або крынічныя німфы, русалкі.
ναΐδιον, τό, малая сьвятыня, капліца, капліčка.
ναιετάω, жыць /у доме/, кватэравацца; засяляць, у- //мясцовіць.
ναίω = νάω, плысьці, пераплываць.
ναίω, жыць /у доме/, кватэравацца, займаць памешканьне; ляжаць на дадзеным месцы, класьці, класьціся; асяліцца, пасяліцца, асесьці /сярод людзей/.
νάκη, ἡ, казьліная шкура; руно; воўна.
νάκος, τό, = νάκη.
νᾶμα, ατος, τό, кажная рэч, якая цячэ: струмень, паток, ручай, крыніца, жарало, выток.
ναμάτιαῖος, α, ον, плаўны, аплывальны.
ναμέρτεια, ἡ, = νημέρτεια, непамыльнасьць, праўда, //рэчаіснасьць.
νάνος, ὁ, карлік.
ναός, ὁ, месца прабываньне бога; сьвятыня; унутраная частка сьвятыні; сьвятое месца, сьвятая сьвятых.
νάπη, ἡ, = νάπος, τό, лясная даліна; лес.
νάρδος, ἡ, нард; шматгадовая травяністая араматычная расліна; нардыйскі алей.
ναρκάω, адубець, скачанець, спруціцца, скасьцянець, памерці. //касьцяненьне.
νάρκη, ἡ, адубеньне, скачаненьне, спруцяненьне, а-
νάρκισσος, ὁ, нарцыз.
ναρκωτικός, які ашаламлівае, наркатычны.
νᾶς, ἡ, = ναῦς. //струмень, раўчук.
νασμός, ὁ, цякучае рэчыва, плынь; крыніца, жарало,
νάσσω, сьціснуць, туга скласьці.
ναστός, ή, όν, густа замешаны; тугі, моцны.
νάττω = νάσσω.
ναυαρχέω, быць адміралам морскае флятылі.
ναυαρχία, ἡ, загадваньне морскаю флётаю; адміральства; адміралітэт.
ναύαρχος, ὁ, камандзір морскае флёты; адмірал.
ναυάτης, ου, ὁ, паэт. для ναύτης.
ναυβάτης, ου, ὁ, той, хто пагрузіўся на вадаплаў, вадаплаўнік, чалавек мора.
ναυβάτης, прым. вадаплаўніцкі.
ναυκληρέω, кіраваць, стырнаваць вадаплавам; быць стырнічым; быць уласьнікам вадаплаву.
ναυκληρία, ἡ, жыцьцё і пакліканьне стырнічага, капітана.

ναύκληρος, ὁ, уласьнік вадаплаву або стырнічы ці капітан, які перавозіць людзей ці груз або адно і дру-
ναῦλον, τό, плата за перавоз людзей //гое разам.
або грузу праз мора.
ναῦλος, ὁ, плата за морскі перавоз людзей або грузу.
ναυμᾱχέω, змагацца на моры або змагацца на вадапла-
ναυμαχία, ἡ, морская бітва. //ве.
ναυπηγέω, будаваць вадаплаў.
ναυπηγία, ἡ, будаваньне або пабудова вадаплаву.
ναυπήγιον, τό, месца будаваньня вадаплаву; док.
ναῦς, ἡ, вадаплаў; ναῦς μακρά, доўгі вадаплаў або
ναυσία, ἡ, морская хвароба. //ваенны.
ναυσιάω, цярпець з прычыны морскае хваробы.
ναύσταθμον, τό, прыпынішча для вадаплаваў, порт.
ναυστολέω, перавозіць морам; канваяваць на моры.
ναυστόλημα, ατος, τό, морскае падарожжа.
ναυστολία, ἡ, плыцьце, плаваньне па моры.
ναυστόλος, ον, высланы вадаплавам.
ναύτης, ου, ὁ, вадаплаўнік.
ναυτικός, ἡ, όν, вадаплаўны; наутычны.
ναυτιλία, ἡ, морскае плаваньне; л.мн., падарожжа.
ναυτίλος, ὁ, вадаплаўнік.
νάφθᾱ, ἡ, нафта, горная аліва, /алей/; /нафталіна/.
νάω, цякчы, плысьці.
νεᾱνίας, ου, ὁ, юнак; νεαγενής, ές, нованароджа-
νεᾱνιεύομαι, быць юнаком; дзейнічаць як мала- //ны.
дзён; выказваць сябе парывіста; быць раптоўным.
νεάζω, быць маладым; думаць як малады.
νεᾱρός,ά,όν, малады, юнацкі; новы, сьвежы.
νέᾱτος, ὁ, пераворваньне а. гараньне папару.
νεάω, узараць а. пераворваць папар або дзірван.
νεβρίζω, насіць наперавес целяча-аленевы кажушок
/Бахусавая ўрачыстасьць/.
νεβρίς, ίδος, ἡ, целяча-аленевая шкурка /ношаная
νεβρός, ὁ, малады алень. //наперавес/.
νε-ηλῦς, ῦδος, ὁ,ἡ, навічок; новапрыбылы.
νεί, /бзот./ = νή.
νεικεστήρ, ῆρος, ὁ, спрачальнік.
νεικέω, спрачацца, сварыцца.
νεῖκος, τό, спрэчка, сварка; дыспута, дыскусыя.
Νειλαιεύς, ὁ, жыхар з-над ракі Нілю.
Νεῖλος, ὁ, рака Ніль; у Гомэра - Αἴγυπτος.
νεῖος, ον, пра людзей: малады, юнацкі; сьвежы.
νειός, οῦ, ὁ, поле, загон; новая зямля; новазагараная зямля, папар.
νείρα або νεῖρα, ἡ, жывот, чэрава.
νείφω, пра сьнег: падаць, засьнежыць, пакрыць сьне-
νεκρᾱγωγέω, весьці на сьмерць. //гам.

νεκρο-βᾱρής, ές, наладаваны, нагружаны трупамі.
νεκρο-δοχεῖον, τό, зьмяшчальнік трупаў, трупярня,
νεκρο-θήκη, ἡ, труна, дамавіна. //могілкі.
νεκρός, ὁ, труп, нябожчык, мяртвец /нэкралёг/.
νεκρόω, умярцьвіць, усьмерціць.
νεκρών, ῶνος, ὁ, месца паховінаў, м.л.:могілкі.
νέκρωσις, ἡ, спрычыненьне сьмерці; паміраньне,
νέκτᾱρ, ᾱρος, ὁ, нэктар, піцьцё багоў. //сьмерць.
νεκτάρεος, η, ον, як нэктар; пахашчны, араматны, бос-
νέκυς, ὁ, труп, нябошчык, мярцьвец. //кі.
νεμεσάω, чуцца справядліва абураным; абурыцца, абурацца, быць злосным; злавацца.
Νεμέσεια, τά, урачыстасьці на чэсьць Нэмэсіс/а/.
νέμεσις, εως, ἡ, сорам, сарамяжнасьць перад няпрыстойнасьцю і ганарлівасьцю; пачуцьцё абычаю, пачуцьцё гонару; абурэньне або неахвочасьць з прычыны няпрыстойнасьці; нараканьне; пакараньне, помста.
Νέμεσις, ἡ, Нэмэсіс, багіня ўзважваючая шчасьце
νέμεσσις, ἡ, эп. νέμεσις. //сьмяротных; б.помсты.
νεμέτωρ, ορος, ὁ, вызначальнік; судзьдзя.
νέμω, раздаць, распадзяліць, вызначыць; выгнаць на пашу, пасьвіць; карміць /жывёлу/, есьці, жэрці.
νεο- прыстаўка, прэфікс; у складзеных словах азначае нешта новастворанае:
νεο-αρβής, ές, нованамочаны, зноў намочаны.
νεό-γαμος, ον, новаажэнены, новапавенчаны.
νεο-γενής, ές, нованароджаны.
νεό-γραπτος, ον, /=νεό-γρᾶφος/, нованамалёваны, нованамаляваны, нованапісаны.
νεοδίδακτος, ον, нованавучаны, новавыстаўлены.
νεόδμητος, ον, новазбудаваны, -пабудованы, -ўзьняты.
νεόδρεπτος, ον, сьвежасарваны, сьвежа зьняты /плод/.
νεοίη, ἡ, юнацкі запал, узьлёт маладосьці.
νεοκατάστᾱτος, ον, новазакладзены, -аседлены.
νεολαία, ἡ, група моладзі, моладзь.
νέομαι, ісьці /на вайну/, прынесьці; адыйсьці.
νέος, νέα, новы; малады /чалавек/; сьвежы.
νεοσσεύω, выводзіць, выседжваць /куранят/, наседжваць /яйца/, выходзіць /зь яйца/.
νεοσσία, ἡ, гняздо птушанят; гняздо; вывад маладых птушанят.
νεόσσιον, τό, = νοσσίον. //чына.
νεοσσίς, ίδος, ἡ, малая птушка; 2. маладая дзяў-
νεοσσός, ὁ, кажны малады зьвер: куранё, пеўнік, птушка; рой пчолаў.
νεότομος, ον, сьвежанакроены, сьвежа гараны, сьвежа гараны; сьвежа зрэзаны /качан капусты/; сьвежасабраны.
νεόφυτος, новапасаджаны; нованавернуты; /нэофіта/; сьвежасьпечаны.

νεο-φιλολογία, ἡ, нэофілялёґія, філялёґія сучасных моваў. //перад нечым новым.
νεο-φοβία, ἡ, новафобія, страх перад зьменамі або
νεοχάρακτος, ον, новаадціснуты; сьвежа а. новавыдрукаваны. //радыкальны, рэвалюцыйны.
νεοχμός, όν, новы, сьвежы, сваеасаблівы, дзіўны;
νεοχμόω, рабіць нешта наваколл, асабліва ўводзіць
νεόω, аднавіць, зьіначыць. //палітычныя інавацыі.
νεοττός, ὁ, пеўнік, куранё; наагул кажны малады
νέρθε = νέρθεν, прыс. пад, с-пад. //зьвер.
νερτέριος, α, ον, падземны, падзямельны.
νέρτερος, α, ον, ніжэйшы, падзямельны /сьвет/.
νέρτος, ὁ, драпежная птушка, коршык, шуляк.
νεῦμα, ατος, τό, знак, азначэньне, засека. //ку.
νευρά = νευρή, ἡ, сухажыльле; струна з с.; цеціва лу-
νεῦρον, τό, сухажыльле; у мн. л. - νεῦρα, сухажыльле ног; у зн.пер. сіла, адвага, харобрасьць, кураж, зухаватасьць; струна; цеціва луку; шнуры рагаткі.
νευρορραφέω, сшываць дратвою; тачаць дратвою боты.
νευρορράφος, ὁ, рымар, шавец.
νευρόσπαστος, ον, /па/цягнуты пры дапамозе шнура; парушаны пры помачы шнура.
νεύω, патакваць ківаць галавою на знак згоды па-
νεφέλη, ἡ, хмара, воблака. //хіляцца; прыракаць.
νεφελόω, хмарыцца.
νεφελωτός, ή, όν, захмураны; пакрыты хмарамі.
νεφοειδής, ές, падобны да хмары. //хмараў.
νέφος, εος, τό, хмара, во лака; сузграмаджэньне
νεφρῖτις, ιδος, ἡ, хвароба нырак.
νεφρός, ου, ὁ, перав. ў мн.л.: ныркі.
νέω, віць, зьвіваць, прасьці.
νέω, сыпаць на кучу, укладваць на гурбу а. на стог.
νέω, плаваць; устыкнуць /нагу ў чаравік/; грамадзіцца.
νεωκορέω, быць чыстым; быць даглядчыкам сьвятыні.
νεωκορία, ἡ, урад або функцыя даглядчыка.
νεωκόρος, ὁ, даглядчык сьвятыні.
νεωμένη, ἡ, нанава загараная зямля.
νεώριον, τό, месца, дзе рамантуюцца вадаплавы, док-
νεώς, ώ, ὁ, сьвятыня. //ярд; арсэнал.
νεώσοικος, ὁ, вадаплаўная будыніна /дасл. вадаплаўны дом/; док, у якім вадаплаў будаваўся або рамантаваўся; склад тавараў. //году, на наступны год.
νέωτα, прысл. нова, сьвежа, нядаўна; наступнага
νεώτατος, η, ον, найв. ст. ад νέος /найнавейшы/, прысл. нова, молада, сьвежа, нядаўна, толькі-што.
νεωτερίζω, зьмяніць /частку ў машыне/, паправіць; увесьці, уводзіць нешта новае; праводзіць аснаўныя зьмены на дарозе рэвалюцыі, рэвалюцыянізаваць; будаваць, адбудоўваць.

νεωτερικός, ή, όν, свомы для маладога веку; малады,
νεωτερισμός, ου, ὁ, новасьць, інавацыя. //юнацкі.
νεωτεροποιΐα, ἡ, новасьць, інавацыя; рэвалюцыя.
νεώτερος, α, ον, выш.ст. ад νέος, маладзейшы, на-
νεωτέρω, прысл. нядаўна. //вейшы.
νη-, неадлуч. прэфікс, як узмацняючая хворма, адказвае бел. без, не: бездапаможны, непрабудны, непапраўны.
νή, атт. часьц. адказвае бел.: так, на: так, напэўна
νηγάτεος, η, ον, новаўчынены.//будзе.., на Зэуса.
νήγρετος, ον, непрабудны. //ка.
νήδυια, ων, τά, патрахі, кішкі, нетры; тоўстая кіш-
νήδυμος, ον, моцны /сон/; салодкі, прыемны.
νηδύς, ἡ, жывот, чэрава, лона.
νηέω, = νηνέω, награмадзіць, насабіраць, награмаджваць, насыпаць у кучу.
νήθω, віць /пугу/, віцца, круціцца; абяртацца; сукаць /дратву/, прасьці /лён/; плесьці /кош/.
Νηιάς, άδος, ἡ = іён. Ναΐάς. //дамы.
νῆις, ιδος, ὁ, ἡ, які ня ведае, ненавучаны, нясьве-
νηκερδής, ές, без заработку, без даходу.
νήκεστος, ον, невылячальны.
νηκουστέω, быць бязуважным а. непаслухмяным.
νηλεόθυμος, ον, бязьлітасны.
νηλεόποινος, ον, бязьлітасна пакараны.
νηλεῶς, прысл. бязьлітасна. //крыўдны.
νηλῑτής, ές, бязвінны, невінаваты; бясшкодны, бяс-
νῆμα, ατος, τό, тое, што зьвіта ці скручана або сплецена: нітка, вяроўка, пуга, павуціна, кош.
νημερτής, ές, нязьменны; стойкі, верны /прынцыпам/; беспамыльны, беспамылкавы; надзейны. //ша.
νηνεμία, ἡ, цішыня /ў паветры/; супакой, застой, ці-
νήνεμος, ον, бязветраны, басправеўны; супакойны.
νηνέω = νηέω.
νῆνις, ιος, ἡ, дзяўчына, дзеўчанё, дзяўчук.
νῆξις, εως, ἡ, плыцьцё, плаваньне.
νηοβάτης, ου, ὁ, = ναυβάτης.
νηοπόλος, ὁ, сьвятар, служыцель у сьвятыні; дагляд-
νηοπορέω, узыходзіць на вадаплаў. //чык сьвятыні.
νηός, οῦ, ὁ, = ναός.
νηπενθής, ές, бястурботны; лагодны, ціхамірны.
νηπία, ἡ, раньняе дзяцінства, маленства.
νηπιαχεύω, быць дзяцінным, забаўляцца як дзіця.
νηπίᾱχος, ον, дзяціны, дзіцячы.
νηπιέη, ἡ, = νηπία.
νηπιότης, ητος, ἡ, = νηπία. //слаўлены.
νήποινος, ον, непакараны; неадпомшчаны; недобра-
νηπύτιος, α, ον, дзяціны, бязмысны.
Νηρεΐς і Νηρηΐς, ἡ, дачка Нэрэуса, згэтуль Нэрэідаю названа або морскаю Німфаю.

Νηρηΐς, ΐδος, ἡ = іён. Νηρεΐς.
νήριθμος, ον, бязьлікі.
νήρῖτος, ον, паэт. хворма ад νήριθμος.
νησιώτης, ου, ὁ, жыхар абтокі, вастравец.
νησιῶτις, ιδος, ἡ, жыхарка абтокі а. востраву.
νησιωτικός, ή, όν, вастраўскі, з абтокі.
νησομαχία, ἡ, бітва на абтоцы а. за абтоку,востраў.
νῆσος, ἡ, абтока, востраў.
νῆσσα = νῆττα, ἡ, качка. //ранё.
νησσάριον і νηττάριον, τό, качанё,качачка,качу-
νηστεία, ἡ, пост; дзень посту.
νηστεύω, пасьціць, паўстрымацца ад /яды/.
νῆστις, ῖδος, ιος або έως, ὁ, ἡ, які посьціць а. паўстрымліваецца ад /яды/, а. здавальняецца без яды.
νηστηΐη, ἡ = νηστεία.
νησύδριον, τό = νησίδιον, τό, вастравок. //месца.
νητός,ή,όν, насыпаны /курган/; навалены на адно
νῆττα, ἡ = νῆσσα, ἡ.
νηῦς, ἡ = ναῦς.
νηφάλιος, α, ον, цьвярозы; бяз /піцьця/ віна.
νῆφον, ονος, паэт., цьвярозы.
νήφω, быць цьвярозым; ня піць віна; жыць разумна.
νήχω, плысьці, плаваць.
νίγλαρος, ὁ, малая дудка, жалейка; труба, сьвісток.
νίζω,/аб/мыць асабліва рукі, ногі, апаласкаць, змыць,
Νίκανδρος, ὁ, Нікандрос, ляконец. //абмыцца.
Νίκαρχος, ὁ, Нікархос, аркадзец.
νῑκαφόρος = νῑκηφόρος. //над, браць верх; перасілець.
νικάω, перамагчы, -гаць, мець перавагу, панаваць
νίκειος, ον, пераможны.
νίκη, ης, ἡ, перамога /ў бітве/; 2. заваёва;
"ἐν τούτῳ νίκα","Гэтым пераможаш".
Νίκη, ἡ, багіня перамогі, Ніке.
νίκημα, τό, узнагарода за перамогу.
Νῑκήρᾱτος, ὁ, Нікератос, атэнец, сын ведамага дзяржаўнага мужа і стратэга Нікіяса, пакараны сьмерцю сыра-
νῑκητήρ, ῆρος, ὁ, пераможнік.//кузцамі ў 413 г. п.н.э.
νικητήριος, α, ον, акрыты хвалаю перамогі; пераможны; узнагароджана за перамогу; урачыстасьць з прычыны
νῑκητής, οῦ, ὁ, пераможнік. //перамогі.
νῑκητικός, ή, όν, свомы перамозе, спрычынены да пера-
νῑκήτωρ, ορος, ὁ, пераможнік, збаўца. //могі.
νῑκηφορέω, выносіць здабычу а. атрымаць узнагароду
νῑκηφορία, ἡ, перамога, перамаганьне. //перамогі.
νῑκηφόρος, ον, які прыносіць перамогу; поўны перамогі; увенчаны а. каранаваны перамогаю.
νικηφόρος, ὁ, ἡ, пераможнік/пераможніца.
Νῑκίας, ου, ὁ, Нікіяс, сын Нікератоса, дзяржаўны муж у Аттэнах і стратэг.

νῑκόβουλος, ον, з перавагаю ў зграмаджэньні.
Νικόλοχος, ό, Нiколохос, спартанец.
Νῑκομαχίδης, ου, ό, Нікомахідэс, мужчынскае імя.
νικομάχος, ου, ό, пераможнік у бітве.
νῖκος, εος, τό, = /пазьней/ перамога.
Νῑκόστρατος, ό, Нікостратос, мужчынскае імя.
Νῑκόφημος, ό, Нікофэмос, мужчынскае імя.
νίν = μίν, энкліт., паэт., дар., він. скл., асабов. займ., трэй. ас., адал. αὐτόν, αὐτήν, αὐτό, яго, яе, яго.
Νίνος, ἡ, Нінос а. Нініва, старажытнае места/сталіца Ассырыі, паложанае над Тыгрысам /368 км ад Багдаду/.
Νῑόβη, ἡ, Ніоба, дачка Танталёса і Дыёны, каралева Тэбаў; з прычыны свайх дзьвенаццацёра дзяцей яна горда пахвалялася, што Лета мае толькі двое.
Νῑπεύς, έως, ό, Ніпэус, сын Харопса і Аглii.
νίπρον, τό, паэт. вада да мыцьця; абмываньне ног.
νιπτήρ, ῆρος, ό, зьмяшчальнік, пасуда да мыцьця.
νίπτω, = νίζω.
Νίσαια, ἡ, Нісаія, партовае места Мэгары насупроць Салямісу.
νίσσομαι, ісьці, адыйсьці, адыходзіць; вярнуць, вярнуцца.
Νῑσύριος, ό, жыхар абтокі Нісырос.
Νῑσυρος, ἡ, Нісырос, спарадычная абтока паміж Косам і Родосам, сягоньня Нісыра.
νίτρον, τό, атт. λίτρον, вуглякіслая соль, вуглякіслата; натрон.
νιφάς, άδος, ἡ, сьняжынка, /сьнег/; пераважна ў мн. л. — мяцеліца, завея, завіруха, кудаса.
νιφετός, ου, ό, мяцеліцца, завея, кудаса.
νιφετώδης, ες, сьнежны, засьнежаны, пакрыты сьнегам.
νῐφόβολος, засьнежаны, забіты сьнегам, замецены сьнегам.
νῑφόεις, сьнежны, засыпаны сьнегам.
νῑφοστιβής, ές, засыпаны сьнегам; пакрыты сьнегам, заваленены сьнегам.
νίφω, няправ. замест νείφω.
νοερός, ά, όν, які думае, разумовы, інтэлектуальны.
νοέω, бачыць, спасьцерагаць, заўважыць, прыкмеціць; думаць, мысьліць, задумацца, памятаць; разважаць.
νόημα, ατος, τό, аб'ект думкі; замер; мэта; завяршэньне; угляд; разумнасьць, мудрасьць, дух /чалавека/.
νοήμων, ον, поўнадумны; задуменны; патонуты ў разваажаньні.
νόησις, εως, ἡ, думка, думаньне.
νοητικός, ή, όν, кемны, інтэлігэнтны.
νοητός, ή, όν, адчувальны, спасьцярожны, прыкметны; зразумелы, выразны.
νοθεία, ἡ, няшлюбнае, няпраўнае нараджэньне; стан няпраўнага дзіцяці.
νοθοκαλλοσύνη, ἡ, падробленая прыгожасьць, хвальшывая, штучная, няшчырая прыгожасьць.
νόθος, η, ον, няпраўны, пазашлюбны, нятоесны, неаўтэнтычны.

νοΐδιον, τό, /пра νόος, νοῦς/ малая думка, пры-
гожая_думке. //чы, вандроўны.

νομᾱδικός, ά, όν, пераходны, номадычны, перасялен-

νόμαιον, τό, звычай, абычай.

νομαῖος, α, ον, перасяленчы, вандроўны, пераходны.

νόμαιος, α, ον, абычаёвы, звычаёвы.

Νομαντία, ἡ, Номенцыя, гішпанскае места.

Νομαντῖνος, ου, ὁ, жыхар места Номанцыі. //натар.

νομάρχης, ου, ὁ, галава правінцыі ў Ягіпце, ґубэр-

νομάς, άδος, ὁ, ἡ, той, хто вандруе з месца на
месца; номад; вандроўнік; Νομάδες, οἱ, номады, па-
стушныя роды,якія пераганялі стады зь месца на месца.

Νόμᾱς, ὁ = Νουμᾶς. //да, гурт.

νόμευμα, ατος, τό, тое, што выганяецца на пашу: ста-

νουμεύς, έως, ὁ, пастух, каняпас, валапас, сьвіня-
пас; даглядчык; вадаплаўнае рабро, шпанта. //вёлу/.

νομεύμω, пасьвіць, выганяць на пашу; карміць /жы-

νομή, ἡ, пасьвішча, выган; паша, корм.

νομίζω, утрымліваць або ўважаць за звычай ці прак-
тыкаваць н.; узнаваць абычай або загад; прыняць або
выконваць абычай; быць павінным; быць абазнаным са
звычаем; быць падпарадкаваным старому праву ці абы-
чаю; спадзявацца, што нешта станецца.

νομϊκός, ή, όν, праўны; абасновбаны правам; абазна-

νομικός, ὁ, праўнік, адвакат. //ны з правам.

νόμῑμος, η, ον, звычаёвы, абычаёвы, традыцыйны, праў-

νομίμως, прысл., паводля права. //ны.

νόμιος, α, ον, пастушы, прыналежны дагляду стада.

νόμῑσις, εως, ἡ, звычай; праўнае агалошаньне; пра-
ва даўнасьці; норма, пастанова; традыцыйная вера а. культ.

νόμισμα, ατος, τό, агульны звычай; аддаўна ўведзе-
нае ўладжаньне; старадаўны звычай; уведзеная манэта,

νομογράφος, ου, ὁ, правадаўца. //нумізматыка/.

νομογράφος, ον, праўны, правадаўчы. //права.

νομοδείκτης, ου, ὁ, паясьняльнік, інтэрпрэтатар

νομοδῑδάκτης, ου, ὁ, паясьняльнік а. вучыцель права.

νομοδιδάσκαλος, ου, ὁ, вучыцель а. выкладчык права.

νομοθεσία, ἡ, правадаўства, леґісьлятура.

νομοθετέω, быць правадаўцам; пісаць права.

νομοθέτημα, τό, права, парадак /у краю/.

νομοθέτης, ου, ὁ, правадаўца.

νομός, ου, ὁ, пасьвішча, выган; паша; адміністра-
цыйны абшар: гміна, павет, правінцыя; сатрапія.

νόμος, ου, ὁ, кажная выдзеленая або распадзеленая
рэч; вызначэньне правам; звычай; пастанова; загад;
дэкрэт; права; пісанае права як супроцьлежнае нату-
рал наму праву – φύσε ;

α) νόμοι, τά, правы – назоў дадзены правам Солёна;

β) Νόμοι, Правы, тытул аднаго з дыялёгаў плятона.

νομοφῦλᾶκέω, стаяць на стражы правоў, перасьцерагаць права.
νομοφύλαξ, ᾶκος, ὁ, стражнік або даглядчык права; пакліканая ў Атэнах установа дзеля дагляду права.
νόος, νόου, сьцісн. νοῦς, νοῦ, ὁ, пачуцьцё,сіла думаньня, памяць; розум, разуменьне; здаровы рассудак; спасьцярожнасьць; разважнасьць, кемлівасьць.
νοούμενον, τό, прадмет разважаньня ў сфэры маральнага пастуляту.
νοσερός, ά, όν, хворы, хваравіты, нядужы.
νοσέω, быць хворым, хварэць, захварэць; цярпець з прычыны недамаганьня. //гляд хворых.
νοσηλεία,ἡ, выдзеліны зь цякучае абалочкі, гной;да-
νοσηλεύω, даглядаць хворага.
νοσηλός, ά, όν, хворы, нездаровы, пашкоджаны.
νόσημα, ατος, τό, хвароба, пошасьць, нядужасьць,
νοσηρός, ά, όν = νοσηλός. //немач, млявасьць.
νόσος, ἡ, хвароба, немач, недамаганьне, нядужасьць; слабасьць, млявасьць; зло; галоўна – зараза, пошасьць; шалёнасьць; няшчасьце; памылка; /носоґэоґрафія/.
νοσοτροφία, ἡ, дагляд хворых; хворасьць.
νοσσεύω, выседжваць, выводзіць птушак; (νεοσσεύω).
νοσσία, ἡ, = νοεσσία. //дзе.
νοσσίον, τό, кураньнё, куранятка, птушанё ў гнязь-
νοσσίς, ίδος, ἡ, маладая птушка; 2. маладая дзяў-
νοστέω, вяртацца, вярнуцца /ісьці назад //чына. дадому/; вярнуцца шчасьліва пасьля небясьпекі. //моў.
νόστῖμος, ον, прыналежны да тых, што вяртаюцца да-
νόστος, ου, ὁ, паварот дадому; прыбыцьце дадому; падарожжа; /настальгія: νόστος + ἄλγος – туга па родным куце, туга па бацькаўшчыне/. //сам для сябе.
νόσφι(ν), νόσφ', прысл. аддалена, далёка,асобна,
νοσφίδιος, α, ον, вылучаны, выдзелены /з грамады/; узяты /з дому/.
νοσφίζω, выдзяліць з; забраць; адлучыць; адчужыцца.
νοσώδης, ες, хворы, хваравіты, нездаровы.
νοτερός, όν, мокры, вільготны, імглісты, парны.
νοτία, ἡ, мокрасьць, вогкасьць, парнасьць; дождж.
νοτίζω, намачыць, размачыць; учыніць вогкім.
νοτίη, ἡ, макрыня, улева.
νότιος, α, ον, мокры, парны; 2. паўдзённы.
νοτίς, ίδος, ἡ, вогкасьць, вільгаць, парнасьць.
νότος, ου, ὁ, паўдзённы а. паўдзённа-заходні вецер; паўздённы а. паўдзённа-заходні квартал ў Атэнах, Аґора.
νοττίς, ίδος, ἡ, куранё, курка; маладая дзяўчына.
νουθεσία, ἡ, перасьцярога; угаворваньне, пераконваньне, заахвочваньне. //іць.
νουθετέω, прывесьці на ўспамін; перасьцерагчы; ра-
νουθέτημα, ατος, τό, угаворваньне, пераконваньне;

заахвочваньне /да навукі/; перасьцераганьне.
νουθετικός, ή, όν, які пераконвае а. перасьцерагае.
Νούμᾶς, ὁ = Νουμᾶς, ὁ, Нума/с/, кароль, князь.
νοῦς, ὁ, скар. ад νόος, розум.
νοῦσος, ἡ, = νόσος.
νύ, гл. νῦν.
νυκτεγερτέω = νυκτερεύω.
νυκτερέτης, ου, ὁ, той, хто вяслуе ноччу.
νυκτερευτικός, ή, όν, адпаведны, здольны да трыманьня стражы ноччу.
νυκτερεύω, /пера/начаваць, асабліва пільнаваць праз ноч; прадпрыняць /атаку/ ноччу; біваакаваць праз ноч, //быць чуйным праз ноч.
νυκτερήσιος, ον, начны.
νυκτερινός, ή, όν, начны, уночы; 2. паўночны.
νυκτερίς, ίδος, ἡ, лятучая мыш.
νυκτερῖνός, ή, όν, = νύχιος.
νύκτερος, ον, начны.
νυκτερωπός, όν, які спатыкае ноч, ноч-спатыканы.
νυκτηγορέω, ноччу спатыкацца, сузграмаджвацца, зыходзіцца. //выправа.
νυκτηγορία, ἡ, начное /су/зграмаджэньне; начная
νυκτηρεφής, ές, спалоханы ўночы; цемраны.
νυκτίβρομος, паэт., праведзеная а. прагуляная ноч.
νυκτίγαμος, ον, ноччу-павенчаны, патаёмны.
νυκτικλέπτης, ου, ὁ, начны злодзей.
νυκτῖκόραξ, ᾶκος, ὁ, ляляк, сінуха, сава, пугач.
νυκτιλαθραιοφάγος, ον, зьедзены патайком уночы.
νυκτιλάλος, ον, начна-сугучны.
νύκτιος, α, ον, начны.
νυκτῖ-πᾶται-πλάγιος, ον які бадзяецца ноччу.
νυκτί-πλαγκτος, ον, ахвочы вандраваць ноччу; парушальны супакой ноччу.
νυκτῖ-πόλος, ον, які вандруе, бадзяецца ноччу.
νυκτι-φανής, ές, зіхацісты, зіяльны а. відны.
νυκτί-φαντος, ον, які зьяўляецца ноччу.
νυκτί-φοιτος, ον, які вандруе а. надыходзіць ноччу.
νυκτο-γραφία, ἡ, пісаньне а. навука ўночы.
νυκτο-θήρας, ου, ὁ, начны паляўнічы.
νυκτο-κλέπτης, ου, ὁ, начны злодзей.
νυκτομᾶχέω, змагацца а. біцца ўночы.
νυκτο-μᾶχία, ἡ, начная бітва, змаганьне папоцемку.
νυκτοπορέω, ісьці або падарожнічаць ноччу.
νυκτο-πορία, ἡ, начны марш; начное падарожжа.
νυκτο-φαής, ές, выдавальны сьвятло ноччу, зіхацістыя.
νυκτοφῦλακέω, стаяць на начнай варце.
νυκτο-φύλαξ, ᾶκος, ὁ, начны вартаўнік, старожа.
νυκτῷον, τό, сьвятыня Ночы.
νύκτωρ, прысл., уночы, уначы, ноччу.
νύμφᾶ = νύνφη.

νυμφαῖον, τό, сьвятыня німфаў.
νυμφαῖος, α, ον, пасьвенчаны німфам.
νυμφεῖα, τά, жанімста; маладая, нарачоная, нявеста.
νυμφεῖος, α, ον, вясельны, шлюбны; прысьвечаны жа-
νύμφευμα, τό, вясельле; жанімства. //німству.
νυμφευτήριος, α, ον, вясельны.
νυμφευτής, ου, ὁ, шафер; жаніх; муж.
νυμφεύτρια, ἡ, дружка /на вясельлі/; маладая.
νυμφεύω, аддаваць дачку замуж; заручваць; жаніць; выходзіць замуж; пабрацца.
νύμφη, ἡ, паэт. νύμφᾱ, маладая, нарачоная; нявеста; маладзіца, маладая жонка; кажная замужняя жанчына; імя ўласнае Німфа - б.ніжэйшае рангі; - німфы прабываюць у крыніцах рэкаў, паміж дрэваў, у моры, на лугох і г.д. зь імёнамі пераважна ў мн. л.: Ναΐδες, Наіды - крынічныя німфы; Νηρηΐδες, Нарэіды - морскія німфы; Νύμφαι ὀρεστιάδες або ὀρεάδες - горныя німфы; Δρυάδες, Ἁμαδρυάδες, Ἀδρυάδες - тры лясныя німфы, якія назоў свой выводзяць ад дрэва дуб (δρῦς); Νύμφαί ὑάδες - німфы дажджу; Νύμφαι λειμωνιάδες - німфы лугоў; Νύμφαι πετραῖαι - німфы скалаў.
νυμφίδιος, α, ον, вясельны.
νυμφικός, ή, όν = νυμφίδιος.
νυμφίος, ὁ, жаніх; 2. муж.
νύμφιος, новаажэнены; вясельны.
νυμφόκλαυτος, ον, аплак/в/аны нявестаю а. жонкаю.
νυμφοκομέω, быць апранальніцаю маладое; апранацца як маладая да вянчаньня; апранаць маладую.
νυμφοκόμος, ον, апрануты да вянчаньня; шлюбны.
νυμφό-ληπτος, ον, апанаваны або натхнёны німфамі; захоплены; у стане трансу; ажыўлены.
νυμφο-στολέω, праводзіць маладую.
νυμφότιμος, ον, уганараваны; адносна маладое: ганараваць маладую песьняю ці песьнямі.
νυμφών, ῶνος, ὁ, пакой жаніха; вясельная заля.
νῦν, прысл., энкліт. цяпер/ака/, якраз у гэтым часе, сягоньня/шнягa дня/; у дадзеную хвіліну, тады.
νύξ, νυκτός, ἡ, ноч; ночная пара; поўнач; цемра.
νυός, ου, ἡ, сыновая, шваґерка.
νύσσα, ης, ἡ, слуп, веха на пачатку і канцы трасы бегу.
νύσσω, пхаць, папіхаць, пхнуць, папіхнуць; калоць.
νυσταγμός, ὁ, сон, драманьне, ністаґмос.
νυστάζω, ківаць галаваю асабл. ў часе схільнасьці да сну; драмаць; спаць; быць склонным да сну.
νύττω = νύσσω.
νύχα, прысл., ноччу, уночы, уначы.
νυχ-εγρεσία, ἡ, уставаньне ўночы. //ваньне.
νύχευμα, ατος, τό, ночная варта, ночнае пільна-

νυχεύω, быць чуйным /пільнаваць/ праз усю ноч.
νυχθήμερον, τό, дзень і ноч, 24 гадзіны; ніхтэма.
νύχιος, α, ον, = νυκτερῖνός, ночны; цёмны як ноч; спавіты ночнаю цемраю.
νωδός, ή, όν, бяззубы.
νωδῦνία, ή, супакой, спыненьне болю. //лёгкі.
νώδῦνος, ον, безбалесны; спакойны, свабодны ад болю;
νώθεια, ή, інэрцыя, безвалоднасьць, бясчыннасьць; пасыўнасьць; зьнеахвочаньне да чыну; павольнасьць.
νωθής, ές, інэртны, безвалодны, павольны, бясчынны,
νωθρός, ά, όν, = νωθής. //аспалы, пасыўны.
νῶι, νώ або νῷ, у наз. і він. скл. парны л. ад ἐγώ, мы два, нас двух. //ад нас двух.
νωΐτερος, α, ον, нашыя два; належыць да нас двух;
νωλεμές, прысл., без перапынку; стала, бесперапын-
νῶμα, τό = νόημα. //на, заўсёды, увесь час.
νωμάω, дзяліць, распадзяліць; ківацца /сюды і туды/; кіраваць, мець пагляд; абыходзіцца /з прадметам/.
νώνυμνος, ον = νώνυμος, ον, бязіменны, няведамы.
νωτᾶγωγέω, несьці на плячох.
νωτίζω, павярнуць плечы; ухіліцца; уцячы.
νῶτον, τό, плечы, лапаткі.
νωτοφόρος, ον, несены на плячох.
νωχελής, ές, павольны, аспалы, бясчынны.
νωχελία, ή, слабасьць, млявасьць, лянота.
νωχελίη, ή, павольнасьць, бясчыннасьць, аспаласьць.

Ξ

Ξ, ξ, ξῖ, τό, ксі, чатырнаццатая літара грэцкае абэцэды.
ξ΄ як лік = 60, але ͵ξ = 60.000.
ξαίνω, скрэпці, часаць /воўну/; кардаваць.
ξανθίζω, хварбаваць, маляваць нажоўта а. набранзова; зарумяніць /на патэльні/; падпражыць набранзова.
Ξανθίππη, ης, ή, Ксантыпа, жонка Сакратаса.
ξάνθισμα, ατος, τό, прадмет захварбаваны нажоўта.
ξανθόθριξ, ό, ή, рыжы, рыжавалосы, -ая.
ξανθός, ή, όν, жоўты, жаўтаваты, пажаўцелы; бледнажоўты, залаты, пазалочаны; чы вона-жоўты; каштановы
ξανθοφυής, ές, натуральна-жоўты. //бранзовы.
ξανθο-χίτων, ωνος, ό, ή, жоўты хітон а. плашч.
ξαν^ό-χρ ς, ον, жоўташкуры.
ξάντης, οι, ό, часальш..ык воўны.
ξάντρια, ή, часальшчыца воўны.
ξείνη, ή = ξένη, госьця. //цінец.
ξεινήιον, τό, гасьцінец для госьця; сяброўск гась-
ξεινίζω, = ξενίζω.
ξεινοσύνη, ή = ξενοσύνη.
ξεινόω = ξενόω.
ξενᾶγέω, быць правадніком падарожнага.

ξένη, ἡ, госьця, чужынка.
ξενηλᾶσία, ἡ, пастанова забараняючая чужынцам уваходзіць у край /Спарта/; пастанова высяленьня з краю.
ξενηλᾰτέω, выгнаць чужынца.
ξενία, ἡ, статус а. прывілея госьця; гасьціннасьць; гасьціннае прыняцьце; прыязныя суадносіны між панyючымі дамамі а. гаспадарствамі; статус а. права чужынца.
ξενίζω, прыняць госьця а. падарожнага; праявіць гасьціннасьць; быць прынятым як госьць; быць а. гаварыць як //чужынец.
ξενικός, ἡ, όν, чужы.
ξένιος, α, ον, прыналежны госьцю; гасьцінны.
ξένισις, ἡ, прыняцьце госьця.
ξενισμός, ου, ὁ, = ξένισις.
ξενιτεύω, быць чужынцам; быць наймітам у чужой арміі.
ξενοδαίκτης, ου, ὁ, забойца госьця. //ца.
ξεν δαίτης, , , той, хто пажырае госьця а. чужын-
ξενοδοκεῖον, τό, месца начлегу чужынцаў, гатэль.
ξενοδοχεῖον, τό, месца начлегу чужынцаў, гатэль.
ξενοδοχέω, = ξενοδοκέω, прыймаць гасьцей; прыймаць на начлег гасьцей або чужынцаў.
ξενοδοχία, ἡ, прыйманьне, гасьця або чужынца.
ξενοδώτης, ου, ὁ, гаспадар дому.
ξένοι, οἱ = (ξενικόν, τό), наёмныя вайсковыя аддзелы; армія наёмных.
ξενοκτονέω, замардаваць гасьцей або чужынцаў.
ξένος, η, ον, чужы, чужыземны, замежны; /ксэнофобія (ξένος + φόβος, страх а. упярэджаньне да чужынцаў/; чужанецкі.
ξένος, ὁ, госьць; чужынец; гаспадар.
ξενόστᾰσις, ἡ, начлег для гасьцей а. чужынцаў; нач- //лежны дом.
ξενοσύνη, ἡ, гасьціннасьць.
ξενοτροφέω, весяліць гасьце або прыйм ць г с ей; раскватэраваць наемнае войска.
ξενοφονέω, мардаваць гасьцей а. чужынцаў.
Ξενοφῶν, ῶντος, ὁ, Ксэнафон, сын Ґрыльлёса, ведамы аўтар, філёзаф і камандзір.
ξενόω, прыняць як госьця а. ўважаць за госьця.
ξενών, ῶος, ὁ, гасьцінны пакой.
ξένως, прысл., пачужынецку.
ξένωσις, ἡ, адчужанасьць; нешта новае.
ξερόν, τό, сухая зямля; суша.
ξερός, ά, όν, сухі; /ξερός+γραφή, ксэроґрафія/.
ξεσμάω, сьціраць, выціраць; выгладжваць.
ξεστός, ά, όν, аскрэблены, выгладжаны.
ξέω, /са/скрэбці, /вы/раўнаць, выпаліраваць; пра- //цаваць на камені.
ξηραίνω, высушыць, падпражыць.
ξηρός, ά, όν, сухі.
ξηρότης, ητος, ἡ, сухасьць дрэва.
ξηροφαγέω, есьці сухую ежу.

ξίσμα, ατος, τό, тое, што ёсьць выгладжаным, выпалі-
ξἰφήρης, ες, азброены мячом; //раваным.
ξιφηφόρος, зь мячом у руцэ.
ξιφίδιον, τό, малы меч.
ξιφοδήλητος, ον, забіты мячом.
ξιφοκτόνος, ον, замардаваны мячом.
ξιφομάχαιρα, ἡ, меч крыху выгнуты ў сваей хворме.
ξίφος, τό, меч.
ξόανον, τό, дрэварыт; статуя.
ξοανοποΐα, ἡ, разьба; прадстаўленае падабенства.
ξοίς, ίδος, ἡ, долата скульптара.
ξυήλη, ἡ, прылада да выгладжваньня дрэва; напільнік;
ξυληγέω, несьці дровы а. дрэва. //выгнуты кінджал.
ξύλινος, η, ον, драўляны, з дрэва.
ξύλον, τό, палена, бервяно; палка; лаўка, стол.
ξυλοτόμος, ον, ссечанае а. сьпілаванае дрэва.
ξυλοτόμος, ὁ, дравасек, лесаруб. //дрэве.
ξυλουργέω, апрацоўваць дрэва; выконваць працу на
ξύλ-ουργία, ἡ, выпрацоўваньне дрэва; цесьлярства.
ξύλουργος, όν, прыналежны да выпрацоўваньня дрэва.
ξύλοχίζομαι, зьбіраць гальлё, трэскі, дровы.
ξύλοχος, ὁ, ἡ, дровы; гушчар, лясок да высекі дро-
ξυλόω, вырабляць, выпрацоўваць дрэва. //ваў.
ξύλωσις, εως, ἡ, драўляны выраб; праца пры пабудове
ξύν = σύν. //дому; зруб хаты; драўляны будынак.
ξῡνῆ, прысл. супольна, грамадзка.
ξυνήια, τά, грамадзкая ўласнасьць,
ξῡνήων, ονος, ὁ, супольнік, уласьнік часткі.//ны.
ξῡνός, ἡ, όν, супольны, грамадзкі, публічны, агуль-
ξῡνο-χάρής, ές, які радуецца ў роўнай меры з іншымі.
ξῡνωνία, = ξῡνωνίη, ἡ, супольнасьць; грамада.
ξῡράω = ξυρέω, стрыгчы, брыць, брыцца.
ξῡρόν, τό, нож да брыцьця.
ξῡροφορέω, несьці, насіць нож да брыцьця.//віваецца.
ξύσμα, ματος, τό, тое, што саскрэбваецца а. выроў-
ξυστίς, ίδος, ἡ, доўгая сукенка з трэнам; тога.
ξυστόν, τό, выпаліраваная палка асабл. кап'ё.
ξυστός, ὁ, пакрытая калёнада з роўнаю і чыстаю пад-
ξυστός, όν, выскраблены, выпалераваны. //логаю.
ξύστρα = ξυστρίς, ἡ, скрэбла.
ξύω, раўняць, выгладжваць, паліраваць.

О

О, о, ὂ μικρόν, омікрон /малое або карткае о у супроцьпастаўленьні да ὂ μέγα - вялікага або доўгага ці падвойнага о - ω /; пятнаццатая літара грэцкае абэцэды.
о́ як лік = 70, але ͵о = 70.000.
ὁ, артыкул акрэсьлены, адказвае нямецкаму der, ён,
ὄαρ, ὄαρος, ἡ, сужаніца, жонка. //гэты, каторы.

ὀαρίζω, гаварыць, выказвацца шчыра, весьці гутарку адкрыта. //не, сяброўская размова.
ὀαρισμός, ου, ὁ, шчырая гутарка, прыемнае выказвань-
ὀαριστής, ου, ὁ, сябра, таварыш, друг, дружа.
ὄαρος, ὁ, сяброўская гутарка, прыемная вымена думкі.
Ὄασις, ἡ, Оаза, назоў ураджайнага месца ў пустыні.
ὀβελίσκος, ὁ, абэліск; востраслуп, пераважна помнік; маналітны высокі і смуглы чатырохкантны слуп за звужэньнем у напрамку свае высокасьці з вастрыём на версе.
ὀβελός, ου, ὁ, шпіц, кажная шпічаста закончаная прылада, выступаючая ўверх; слуп закончаны шпіцам.
ὀβολός, οῦ, ὁ, оболь, грош; дробная манэта ў ст.Грэцыі вартасьцю аднае шостае драхмы = 8 халкой.
ὄβρια, τά, /мн. л./ = ὀβρίκαλα, τά, маладзенькія зьвяры, маладое зьвяр'ё.
ὀβρίμος, ον і η, ον, сільны, моцны, магутны.
ὀβολός, οῦ, ὁ, оболь /манэта/.
ὀγδοήκοντα, οἱ, αἱ, τά, восемдзесят.
ὀγδοηκοστός, ή, όν, васемнаццаты.
ὄγδοος, η, ον, восьмы.
ὀγδώκοντα, οἱ, αἱ, τά, восемдзесят.
ὅ-γε, ἥ-γε, τό-γε, паказ. займ., пра месца: вось тут/ака/, якраз тут (τῇγε); з гэтае якраз прычыны (τόγε).
ὄγκος, ὁ, гурба, куча; звал, накід, гурт; пра валасы: кукса, закрут, каса, завіцьцё, чупрына; вага, важнасьць, гордасьць; клопат, труднасьць.
ὀγκόω, насыпаць, злажыць, накідаць на кучу, на гурбу; пра хвалю: узднмацца; чуцца ганаровым.
ὀγκωτός, ή, όν, узьняты /курган/; насыпаны /ў гурбу/.
ὄγμος, ὁ, кажная рэч выцягнутая ўздоўж: баразна, роў, лінія, сьцежка, дарога, шлях нябесных целаў.
ὄγχνη, ἡ, ігрушавае дрэва; ігруша.
ὀδάω, несьці, вынесьці, выносіць, панесьці.
ὅ-δε, ἥ-δε, τό-δε, паказ. займ., створанае дарогаю даданьня энкл. δε да старога паказ. займ.: ὁ, ἡ, τό, гэты, гэтакі, які, што, катсры; тут; якраз, вельмі; гэты самы; у гэтым /часе/.
ὁδεύω, падарожнічаць, адбываць падарожжа; ісьці.
ὁδηγέω, узыйсьці на дарогу, паказаць дарогу; правесь-
ὁδηγός, ὁ, праваднік. //ці па дарозе.
ὅδιος, ον, дарожны /знак/.
ὅδισμα, ατος, τό, сродак транспарту: дарога, шлях.
ὁδίτης, ου, ὁ, бадзяка, вандроўнік, падарожны.
ὀδμή, ἡ, духмянасьць; 2. смурод.
ὁδοιπορέω, адбыць падарожжа; падарожнічаць, ісьці.
ὁδοιπορία, ἡ, падарожжа /на сушы/; дарога; вандраваньне, падарожнічаньне, марш.

ὁδοποιέω, рабіць, раўняць дарогу; учыніць карысным; вывесьці на дарогу.
ὁδός, οῦ, ἡ, дарога, шлях, гасьцінец/бальшак, сьцежка; σχιστή ὁδός, крыжовая дарога.
ὀδός, οῦ, ὁ, парог.
ὀδούς, ὁ, зуб.
ὁδόω, весьці правільнаю дарогаю; увайсьці ў каляіну.
ὀδυνάω, спрычыняць боль а. цярпеньне; цярпець.
ὀδύνη, ἡ, боль, цярпеньне, перажываньне.
ὀδυνηρός, ᾱρός, ά, ή, балючы, які баліць.
ὀδυνηρῶς, прысл. балюча. //не.
ὄδυρμα, ατος, τό, заводжаньне /плач/, лямэнтаваньὀδύρομαι, аплакваць, насіць жалобу; сумаваць па н.
Ὀδυσσεία, ἡ, Одысэя.
Ὀδυσσεύς, έως, ὁ, Одысэуш.
ὀδύσσομαι, злавацца а. быць злосным на; памставаць.
ὀδωδή, ἡ, нюх, пачуцьцё нюху.
ὀδών, όντος, ὁ, зуб. //тычны.
ὁδωτός, ή, όν, праходны, магчымы /прайсьці/; пракὄζος, ου, ὁ, ветка, голька, парастак.
ὄζω, пахнуць /прыемна ці няпрыемна/, мець пах.
ὅθεν, прысл. скуль, якім спосабам /чынам/, як?
ὀθνεῖος, α, ον, чужы.
ὅθι, прысл. дзе.
ὀθόνη, ἡ, пераважна ў мн.л.: тонкае белае палатно; палатняная вопратка, адзежа, рызьзё; прасьцірадла аб-
ὀθόνινος, η, ον, выкананы зь ільну, ільняны. //рус.
ὀθόνιον, τό, памянш., рэч выкананая з тонкага палат-
οἴ, ускл. ой, ай, о, а. //на.
οἱ, наз. мн. л. муж. ад арт. ὁ.
οἵ, наз. мн. л. муж. ад адн. займ. ὅς.
οἱ, дав. адзін. трэйц. муж. і жан. для займ. αὐτῷ. αὐτῇ, яму, ёй.
οἷ, куды, як далёка, да якое ступені.
οἰδάνω, напухнуць, успухнуць.
οἰδέω, пухнуць, напухнуць, успухнуць.
οἴδημα, τό, напухласьць, напухшае месца, скула.
οἶδος, τό, напухліна, скула.
οἴεος, α, ον, з авечае або баранавае шкуры.
οἰ-έτης, ες, аднагодні, аднагадовы.
οἰζύς, ἡ, гора, сум, туга, няшчасьце, цярпеньне.
ὀϊζυρός, ά, όν, абцяжаны горам; прыгноблены, сумны.
οἰζύω, плач наўзрыд; заводжаньне; цярпець у горы.
οἶς, ἴδος, ἡ, авечка, авечачка.
οἴκαδε, прысл. дадому; у напрамку дому, род. краю.
οἰκεῖος, α, ον, хатні, родны, свой.
οἰκειότης, ἡ, сваяцтва, сяброўства, жаніцтва.
οἰκείως, прысл. пасяброўску, адпаведна, натуральна.

οἰκετεία, ἡ, сям'я; хатняя служба; чэлядзь.
οἰκετεύω, жыць /у хаце/, кватаравацца.
οἰκέτης, ου, ὁ, семянін; чаляднік.
οἰκέω, кватаравацца, жыць /разам/; займаць кватэру; асяліцца, асесьці на жыльлё; мець уласнасьць. //рог.
οἴκημα, τό, месца жыльля; дом; хлеў, загарода; вастοἴκησις, ἡ, права жыльля; месца жыцьця; дом, хата.
οἴκητης, ου, ὁ, жыхар дому.
οἰκία, ἡ, дом, жыльлё; гаспадарка; забудаваньне.
οἰκίδιον, τό, малы дом, домік.
οἰκίζω, будаваць дом; закласьці асельле; залюдніць.
οἰκίον, τό,(οἶκος), заўсёды ў мн.л. οἴκια, τά, дом, месца, месца жыцьця; аселасьць.
οἴκισις, ἡ, забудаваньне; калёнізацыя. //ветка.
οἰκίσκος, ὁ, дом, домік, пакой; хлявушок, падпаοἰκιστής, ου, ὁ, жыхар, асяленец, пасяленец.
οἰκοδεσποτέω, быць гаспадаром дому.
οἰκοδομέω, будаваць, пабудаваць, збудаваць дом.
οἰκοδομή, ἡ, будаваньне; будынак; направа дому.
οἰκοδόμημα, τό, жыльлёвы будынак; дом. //дынак.
οἰκοδομία, ἡ, пабудова дому; спосаб будаваньня; буοἰκοδομική, ἡ,/у зн. τέχνη/, архітэктура.
οἰκοδομικός, ή, όν, здольны ў будаваньні. //тар.
οἰκοδόμος, ὁ, цясьляр, будаўнічы майстра, архітэкοἴκοθεν, прысл. з уласнага дому, з дому.
οἴκοι, дома.
οἰκονομέω, гаспадарыць у доме; быць гаспадаром.
οἰκονομία, ἡ,кіраваньне хатнімі справамі; гарадсοἰκονομικός, ή, όν, абазнаны ў справах //кая ўправа. вядзеньня гаспадаркі; ашчадны, эканамічны /эканоміка/.
οἰκονομικῶς, прысл. эканамічна, ашчадна, разумна.
οἶκος, ου, ὁ, дом, хата; жыльлё, кватэра, будынак, пакой, камора; дом божы; нярухомасьць; як прым. хатні, сямейны, родны /кут/.
οἰκόπεδον, τό, месца пад забудову; пабудова, дом.
οἰκουμένη, ἡ, цывілізаваны сьвет; уся заселеная Зямля /γλεб/, гл. οἰκέω; экумэна. //дома.
οἰκουρέω, пільнаваць дом; утрымліваць дом; астацца
οἰκούρημα, τό, пільнаваньне/дагляданьне дому.
οἰκοφθορέω, давесьці да руіны дом; згубіць маеοἰκοφθορία, ἡ, руіна, зьнішчэньне, заняпад.//масьць.
οἰκτείρημια, τό, спагада, літасьць.
οἰκτείρησις, ἡ, літасьць, спагада.
οἰκτείρω, літасьць, мець літасьць; спагадваць, мець спагаду, спаўчуваць, мець спаўчуваньне.
οἰκτιρμός, ου, ὁ, спагада, літасьць, міласэрдзьдзе.
οἰκτίρμων, ον, спагадлівы, поўны спагады а. літасьці.
οἴκτιρμα, ατος, τό, плач з заводжваньнем.
οἰκτισμός, ου, ὁ, лямэнтаваньне, плач.

οἶκτος, ου, ὁ, ласка, літасьць, спагада; спаўчу-
ваньне, выражэньне спаўчуваньня. //насьць гаспадыні.
οἰκωφελία, ἡ, прыбытак у дом; ашчаднасьць, старан-
οἶμα, ατος, τό, атака з бравураю; скок пантэры, іль-
ва, імклівы налёт коршыка.
οἴμη, ἡ, дарога, шлях /асягненьня/; вядзеньне /на-
прамак/ апавяданьня; апавяданьне, паэма. //зямлі.
οἶμος, ου, ὁ, шлях, дарога, сьцежка; пласт, кусок
οἰμωγή, ἡ, крык, плач, лямант.
οἴμωγμα, ατος, τό, плач зь лямантам.
οἰμωγμός, ὁ, лямантаваньне, пляканьне, плач.
οἰμώζω, плакаць, заводзіць у плачу, лямантаваць.
οἴνη, ἡ, вінаградная лаза, віно; віно.
οἰνηρός, ά, όν, вінны, вінаградны.
οἰνήρυσις, ἡ, /па/судзіна да сьцягваньня віна.
οἰνίζω, чуць пах віна; чуць віном; купляць віно.
Οἰνόη, ης, ἡ, Ойноя, атэнская крэпасьць на бэоцкай
οἰνόμελι, ιτος, τό, пчаліны мёд зьмешаны зь //мяжы.
віном; мёд /пітво/.
οἰνοπέδη, ἡ, зямла прыдатная да гадаваньня вінагра-
οἰνόπεδος, ον, прыдатны да га- //ду, вінаграднік.
доўлі вінаграду; які аплывае віном.
οἰνοπέπαντος, ον, пра віно: гатовы да фэрмэнтацыі.
οἰνοποτάζω, піць віно.
οἶνος, ου, ὁ, віно.
οἰνοφαγία, ἡ, спажываньне віна, піцьцё віна.
οἰνοφλυγία, ἡ, ахвота да піцьця а. п'янства.
οἰνοχοεύω, наліваць віно, адліваць віно, выліваць
οἰνοχοέω, быць віначэрпам, наліваць віно. //віно.
οἰνοχόη, ἡ, ойнохія, адумыснае глінянае начыньне
зь дзюбам да наліваньня віна ў паасобныя чары.
οἴομαι, здагадвацца, думаць, дапускаць думку, спа-
οἰνόω, ап'янець віном, упіцца. //дзявацца.
οἰνών, ῶνος, ὁ, вінны склеп а. магазын.
οἰό-βατος, ον, адлюдны, самотны.
οἰο-βουκόλος, ον, пастух аднае каровы.
οἰό-γαμος, ον, аднажэнны.
οἰο-ζωνος, ον, самотны, сам, адзін у жыцьці.
οἴομαι, думаць, верыць, здагадвацца; баяцца.
οἰο-ποκος, ον, выстрыжаны з авечкі.
οἰο-πολος, ον, самотны.
οἷος, οἷα, як гэтакі; якога роду, што за адзін, які
/гэта чалавек/, як гэта, як. //торы.
οἶος, οἴη, οἶον, сам, сам адзін: той самы, які, ка-
ὄϊς, ὁ, ἡ, авечка, баран.
οἴσπη, ἡ, авечы гной; нямытая брудная воўна.
οἰσπώτη, ἡ, бруд на тыльнай частцы авечкі.
ὀϊστεύω, /за/пускаць стрэлы.
ὀϊστός = οἰστός, οῦ, ὁ, страла.

οἰστράω, падбадзёрваць; пра сьляпень: заядаць, кусаць, джаліць, даводзіць да ашалеласьці.
οἰστρ-ήλᾶτος, ον, узбударажаны, гнаны сьляпенямі.
οἴστρημα, ατος, τό, укус сьляпеня; джала; ашале- //ласьць.
οἰστρο-δίνητος, ον, гнаны навакол сьляпенямі.
οἶστρος, ου, ὁ, сьляпень, авадзень; машкара; джала; //ашалеласьць.
οἰσύπη, ἡ, = οἴσπη, ἡ.
οἰσυπηρός, ά, όν, пра нямытую воўну: брудны.
οἶτος, ου, ὁ, доля; няшчасьце, цярпеньне, сьмерць.
οἰχνέω, ісьці, прыйсьці; пра птушкі: ляцець, лётаць; хадзіць, быць жывым, рухацца, кратацца, жыць.
οἰχνέω, эп. = οἴχομαι, адыходзіць.
οἴχομαι, ісьці, хадзіць, вандраваць, адыходзіць, адыйсьці, аддаляцца.
οἴω, прадчуваць, здагадвацца, спадзявацца /што н. здарыцца/; баяцца, палохацца; несьці, зносіць, цярпець.
οἰωνίζομαι, прыймаць прадвесьце зь лёту і голасу птушак.
οἰώνισμα, ατος, τό, варажба зь лёту птушак.
οἰωνιστήριον, τό, прадвесьце, омэн; месца, зь якоганазіраецца лёт птушак.
οἰωνιστής, οῦ, ὁ, той, хто прадказвае на падставе лёту і крыку птушак.
οἰωνό-θροος, ον, пра птушак: крыклівы, галосны.
οἰωνό-μαντις, εως, ὁ, тлумач, паясьняльнік, інтэрпрэтар лёту і крыку птушак.
οἰωνός, οῦ, ὁ, хіжацкая птушка, вялікшая птушка; коршык, сьцярвятнік, арол; птушка прадвесьця.
οἰωνοσκοπέω, назіраць лёт і крык птушак; прыймаць прадвесьце зь лёту і крыку птушак.
οἰωνο-σκόπος, ον, птушканазіральны.
ὄκᾶ, дор. замест ὅτε, калі.
ὀκλάδίας, ου, ὁ, складальнае сядзэньне /крэсла/.
ὀκλάζω, апусьціцца на калені, укленчыць; сагнуць к.
ὀκνέω, паўстрымлівацца ад; быць нерашучым а. няпэўным.
ὀκνηρός, ά, όν, паўстрыманы, нерашучы.
ὄκνος, ὁ, паўстрыманьне, нерашучасьць, няпэўнасьць; адступленьне ад н.; хістаньне, трусьлівасьць.
ὀκτάγωνος, ὁ, васьмікутнік; васьмікутны будынак, октагон.
ὀκτα-δάκτυλος, ον, васьміпальцавы.
ὀκτα-ήμερος, ον, васьмідзенны; на восьмы дзень.
ὀκτάκις, прысл. восем разоў.
ὀκτακις-χίλιοι, αι, α, восем тысяч.
ὀκτά-μηνος, ον, васьмімесячны.
ὀκτά-πεδος, ον, васьміножны.
ὀκτα-πλάσιος, α, ον, васьмістолкавы.
ὀκτα-πόδης, ου, ὁ, васьмі-футовец.
ὀκτά-πους, ὁ, ἡ, доўгі ў восем футаў.
ὀκτάς, ἡ, лік /як гэтакі/ восем.
ὀκτώ, οἱ, αἱ, τά, восем /прадметаў/; сам лік

восем, як гэтакі — ὀκτάς, ἡ.

ὀκτω-δάκτυλος, ον, васьміпальцавы.

ὀκτω-καί-δεκα, οἱ, αἱ, τό, васемнаццаць: восем і дзесяць.

ὀκτω-και-δέκατος, η, ον, васемнаццаты.

ὀκτω-και-δεκ(α)-έτης, ον, васемнаццацігодні.

ὀλβίζω, /па/цешыць, /па/радаваць. //чыні.

ὀλβιο-δαίμων, ονος, ὁ,ἡ, шчасьлівае долі а. буду-

ὀλβιό-μοιρος, ον, шчасьлівае долі.

ὄλβιος, ον, ашчасьліўлены, шчасьлівы, радасны, добраслаўлены; памысны.

ὀλβιστος, η, ον, найв. ст. ад ὄλβιος, найшчасьнейшы, найболей шчасьлівы.

ὀλβίως, прысл. шчасьлівы, шчасны.

ὀλβο-δοτήρ, ῆρος, ὁ = ὀλβο-δότης, ου, ὁ, даўца добрае долі а. шчасьця ці памыснасьці.

ὄλβος, ου, ὁ, шчасьце, добраслаўленьне; дабрабыт.

ὀλέθριος, ον, зьнішчальны, дэструкцыйны, сьмярот-

ὄλεθρος, ὁ, зьнішчэньне, руіна, спусташэньне. //ны.

ὀλέκω, нішчыць, руйнаваць, забіваць.

ὀλεσ-ήνωρ, ορος, ὁ,ἡ, нішчыцель, зьніштажальнік.

ὀλεσί-θηρ, ῆρος, ὁ,ἡ, нішчыцель дзікіх зьвераў.

ὀλέτειρα, ἡ, ж. род ад ὀλετήρ.

ὀλετήρ, ῆρος, ὁ, нішчыцель, разбуральнік.

ὀλέτις, ιδος, ἡ = ὀλέτειρα.

ὀλιγάκις, прысл. рэдка, час ад часу.

ὀλιγ-άμπελος, ον, мала або недахоп віна.

ὀλιγανδρέω, быць у нястачы мужчын.

ὀλιγανδρία, ἡ, нястача а. недахоп мужчын /для войска або ў месьце/.

ὀλίγ-ανδρος, ον, у недахопе мужчын.

ὀλιγανθρωπία, ἡ, нястача, недахоп людзей.

ὀλιγ-άνθρωπος, ον, нястача людзей.

ὀλιγ-αρχέομαι, быць кіраваным а. ўпраўляным некалькімі людзьмі; быць аб'ектам для оліґархіі.

ὀλιγαρχία, ἡ, оліґархія /аліґархія/, панаваньне не вялікае групы людзей /багатых а. арыстакратаў/.

ὀλιγαρχικός, ή, όν, оліґархічны.

ὀλιγαχόθεν, з розных мясьцінаў; з малых частак.

ὀλιγηπελέω, быць слабым а. бясьсільным.

ὀλιγη-πελής, ές, слабы, бясьсільны.

ὀλιγηπελία, ἡ, кволасьць, хілкасьць.

ὀλιγήριος, ον = ὀλίγος, малы.

ὀλίγιστος, гл. μικρός.

ὀλίγιστος, η, ον, малы.

ὀλιγογονία, ἡ, недахоп прадуктаў, неўраджайнасьць.

ὀλιγό-γονος, ον, малаўраджайны, неўраджайны.

ὀλιγο-δρανής, ές, бясьсільны, слабы.

ὀλιγοδρανία, ἡ, кволасьць, млявасьць, бязьверра.

ὀλιγο-έτης, ες, малалетні, некалькігодні.
ὀλιγοετία, ἡ, малалетнасьць, маладосьць, юнацкасьць.
ὀλιγοπιστία, ἡ, малавернасьць, слабая вера.
ὀλιγό-πιστος, η, ον, малаверны, малое веры.
ὀλίγος, η, ον, некалькі, крыху, крышку.
ὀλιγοστός, ή, όν, адзін зь некалькі, толькі крышку.
ὀλιγότης, ητος, ἡ, маласьць, некалькасьць.
ὀλιγοτροφέω, даць крышку пажывы.
ὀλιγο-χρόνιος, ον, трывалкі адно кароткі час; кароткае трывалкасьці.
ὀλιγωρία, ἡ, грэбаваньне, няўвага; пагарда.
ὀλίγ-ωρος, ον, малапаважаны; занядбаны.
ὀλίγως, прысл. мала.
ὀλισθάνω, пасьлізнуцца, сьлізгацца; упасьці.
ὀλκή, ἡ, перавага; цягненьне; вага, цяжар /шалі/.
ὀλκός, ή, όν, прыцяжны, атракцыйны.
ὄλλυμι, /зь/нішчыць, зьнiштожыць; зьнікнуць, шчэзнуць; /с/кончыць /жыцьцё/, памерці, паміраць.
ὀλλύω, /зь/нішчыць; памерці, скончыць /жыцьцё/.
ὅλμος, ὁ, круглы гладкі камень; гала, куля.
ὀλοθρευτής, οῦ, ὁ, зьнішчальнік.
ὀλοτρεύω, зьнішчыць.
ὀλοιός, όν, зьнішчальны. //вяру.
ὁλοκαυτέω, прыносіць, прынесьці ўсёспальваную ах-
ὁλόκαυτον, τό, усёцэлая ахвяра.
ὁλόκαυτος, ον, усёспалены, суцэльна спалены; /згэтуль - голёкаст/. //вяру.
ὁλοκαυτόω, усё спальваць; спальваць усёцэлую ах-
ὁλοκληρία, ἡ, суцэльнае здароўе.
ὁλόκληρος, ον, закончаны а. выканчаны ў кажнай сваей частцы; цэлы, здаровы, дасканалы. //манту.
ὀλολυγή, ἡ, кажны голасны крык; выклік радасьці /ля-
ὀλόλυγμα, ατος, τό, голасны крык пер. радасьці.
ὀλολυγμός, οῦ, ὁ, голасны плач радасьці; выражэньне здаволеньня.
ὀλολύζω, голасна прасіць багоў; крычаць, галасіць.
ὁλο-μελής, нераспадзелены. //суцэльнасьць.
ὅλον, τό, цэлае, нешта ўзятае ўсё разам, усё цэлае;
Ὀλονδεύς, έως, ὁ, Олёндэуш, спартанец.
ὀλοοί-τροχος, = ὀλοί-τροχος = ὀλοί-τροχος, ὁ, камень, які спадвае з абрыву.
ὀλοός, η, ον, зьнішчальны, зьніштажальны; загубны, шкодны, страшны, жахлівы, сьмяротны. //галіць.
ὀλόπτω, цягнуць, выцягнуць; зьдзерці, абдзерці, а-
ὅλος, η, ον, суцэльны, цэлы, камплетны.
ὁλο-σχερής, ές, цэлы, суцэльны, камплетны, важны.
ὁλό-σχιστος, расколаты, расшчыплены.
ὁλο-τελής, ές, дасканалы.
ὀλοφυδνός, ή, όν, наракальны, заводны, плачлівы.

ὀλοφυρμός, οῦ, ὁ, заводжаньне ў плачу; нараканьне.

ὀλοφύρομαι, плакаць, заводзіць, лямантаваць, наракаць; прасіць са сьлязамі ў вачох.

ὀλόφυσις, εως, ἡ, = ὀλοφυρμός.

ὀλοφώιος, ον, падступны, здрадны, здрадлівы.

ὄλπη, ἡ, шкураная бутэлька на аліву, алей.

ὄλπις, ιδος, ἡ = ὄλπη.

Ὀλυμπία, ἡ, Олімпія, раўнінная акруга ў даліне старажытнага Элісу, з ракою Альфэос, у зах. Пэлёпоннэзе, дзе кожны чацьверты год адбываліся Олімпійскія гульні і спаборніцтвы.

Ὀλύμπια, τά, Олімпійскія гульні і спаборніцтвы, запачаткаваныя Гэркулесам і адноўленыя Іфітосам, якія адбываліся кожны чацьверты год на чэсьць Олімпійскага Зэуса.

Ὀλυμπιεῖον, τό, сьвятыня Олімпійскага Зэуса.

ὀλυμπιο-νίκης, ου, ὁ, пераможца на Олімпійскіх гульнях і спаборніцтвах.

Ὄλυμπος і Οὔλυμπος, ὁ, Олімп, высокі горны ланцуг на пагранічу паміж Македоніяю і Тэсаліяю; у грэцкай міталёгіі слаўная сяліба багоў.

ὀλύνθη, ἡ = ὄλυνθος.

ὄλυνθος, ἡ, фіга, якая расьце зімою.

ὄλῡρα, ἡ, род зярна, полба або спэльт. //кажучы.

ὅλως, прысл. цалкам, усё разам, агульна, коратка

ὅμαδος, ὁ, усеагульны крык, гоман.

ὁμαίμιος, ον, сваяцкі, спароднены. //тра, брат.

ὅμ-αιμος, ον, тае самае крыві, зроднены, як мян. сяс-

ὁμαιμοσύνη, ἡ, сваяцтва. //нае змаганьне.

ὁμαιχμία, ἡ, саюз самаабароны, братэрства; суполь-

ὅμ-αιχμος, ὁ, саюзьнік, супольны змагар.

ὁμᾰλής, ές, роўны, выраўнены, гладкі.

ὁμᾰλίζω, /вы/раўняць, выраўноўваць.

ὁμᾰλός, ή, όν, роўны.

ὁμαλότης, ητος, ἡ, роўнасьць, роўнаякаснасьць.

ὁμαλῶς, прысл. роўна.

ὁμ-αρτέω, сходзіцца, зыйсьціся, суэграмадзіцца; спаткацца; ісьці разам; трымаць крок; імкнуцца да мэты.

ὁμαρτῆ або ὁμαρτῇ прысл. разам, супольна, талакою.

ὅμασπις, ῐδος, ὁ, ἡ, саюзьнік зброі, ваяр, жаўнер, змагар, сябра, таварыш.

ὁμαυλία, ἡ, супольнае жыцьцё; аб'еднаньне, злучэньне, хаўрус; супольнасьць. //манізаваны.

ὅμαυλος, ον, супольная гра на флейце; зграны, згар-

ὀμβρέω, пра дождж: падаць, ісьці, ліць як зь вядра.

ὀμβρηρός, ά, όν, дажджысты, мокры, сыры.

ὄμβρῖμος, ον = ὄβριμος.

ὄμβριος, ον, дажджавы.

ὀμβροκτύπος, ον, улеўны /дождж/.

ὄμβρος, ὁ, дождж, улева; бура з дажджом і грымотамі.
ὀμέφιος, ὁ,ἡ, сябра гульні. //век; сябра.
ὁμῆλιξ, ικος, ὁ, адналетак, равесьнік; аднолькавы
ὁμηρεία, ἡ, залог, заклад, запэўненьне.
ὁμηρεύω, быць заложнікам; служыць як заклад.
ὁμηρέω, зыйсьціся разам, спаткацца; злучыцца, аб'еднацца; згадзіцца.
σπορά, ἡ, сяяньне, пасеў, засяяньне; зачацьце дзіцяці, запладненьне; нараджэньне; пакаленьне; пара сяў-
Σποράδες, αἱ, спорады: група вастравоў на зах. //бы. узьбярэжжы Малое Азыі як і ў паўночна-заходняй частцы Эгейскага мора.
σπορεύς, έως, ὁ, сяўбіт.
σπορητός, ὁ, = σπόρος.
σπόριμος, ον, сеяны.
σπόρος, ὁ, = σπορά, сяўба, сяяньне; час сяўбы; семя, насеньне; зярно, збожжа.
σποῦ, /сярод скітаў/ вока.
σπουδάζω, сьпяшацца хутка ісьці; быць вельмі занятым працаю; рабіць з пашанаю; быць паважным.
σπουδαιολογέω, = σπουδαιολέομαι, гаварыць паважна, абгаварваць а. дыскутаваць важныя справы; сказаць //паважна, рашуча.
σπουδαίως, прысл. паважна.
σπουδαρχέω, імкнуцца да ўрадавае пасады.
σπουδαρχία, ἡ імкненьне да ўрадавага становішча.
σπούδασμα, ατος, τό, імкненьне, стараньне.
σπουδαστής, οῦ, ὁ, староньнік, прыхільнік, прыяцель, аднадумец.
σπουδή, ἡ, пасьпех, хуткасьць, запал, павага.
σπῦρίς, ἡ, кругла-сьплецены кош; кош на рыбу.
στάγμα, ατος, τό, капля, цякоміна, стаґма.
στᾰγών, όνος, ἡ, капля; капля дажджу; сьляза.
στάδαῖος, α, ον, выпрастованы, просты, роўны.
στάδην, прысл. проста.
στᾰδιοδρομέω, бегаць на стадыёне; браць удзел у перагонках.
στάδιον, τό, стадыён, у старажытнай Грэцыі - месца прадназначанае на спаборніцтвы і гульні; 2. мн. л.: στάδιοι, οἱ або στάτια, τά - агульнапрынятая стара-

грэцкая мера даўжыні: стадыя, мн.л.: стады.
στάζω, капаць, накапаць.
στάθεύω, спражыць, сасмажыць, спаліць.
σταθμάω, мерыць пад шнур, пад васэр-вагу; вымерыць, адмерыць, вымеркаваць. //парадак, норма.
στάθμη, ή, мулярскі шнур; васэр-вага; рэґула, права,
σταθμός, ό, стаянка, месца пастою; будынак для жывёлы; стойла; хата, дом; начлег; дзень падарожжа; падпо-
σταῖς,= σταίς, τό, цеста. //ра, шула; раўнавага; вага.
σταίτῖνος, η, ον, зь цеста, цеставы.
στάλα, = στήλη, ή. //міт.
στάλαγμα, ατος, τό, тое, што капае; капля; /сталяґ-
στάλαγμός, ό, капаньне; капля.
στάλάσσω, = στάζω.
στάμίν, = στάμίς, ίνος, ή, кажная рэч пастаўлена проста, слуп, кол, помнік. //ца, сварыцца.
στάσιάζω, бунтавацца, уздымаць рэвалюцыю; спрачац-
στάσιασμός, ό, уздым да бунту; абурэньне, паўстаньне.
στάσιμον, τό, у трагэдыі: бесперапынная песьня хору.
στάσιμος, ον, які моцна стаіць а. пастаўлены; стойкі.
στάσις, εως, ή, стаяньне, пастава, стоячая пастава; стан рэчы; поза, палажэньне; пазыцыя, месца; застава /ваенная/; падпільнаваньне; жыльлёвы будынак; уставаньне, паўстаньне, бунт, абурэньне, гнеў; змаганьне партыяў; рэвольта, рэвалюцыя; палітычнае зьначаньне; раздваеньне, раскол; неадзінасьць; сварка, грызьня, змаганьне, варожасьць; партыя, палітычная арганізацыя, клюб, аб'еднаньне, фракцыя, група, кляса, сэкта, школа /думкі/.
στάσιώδης, ες, паўстанчы, рэвалюцыйны, бязладны, распадзелены.
στάσιώτης, ου, ό, бунтаўшчык, сябра партыі а. фракцыі; удзельнік бунту.
στάτήρ, ῆρος, ό, кажны цяжар; манэта пэўнае вагі, статэр; у Атэнах - сярэбраны статэр, які роўнаважны быў двум драхмам.
στάτίζω, умясцовіць; быць пастаўленым.
στάτική, ή, статыка, навука, якая вывучае свомасьці целаў у стане супачынку /нярухомым/ а. роўнавагі.
στάτικός, ή, όν, статычны, нярухомы; спрыч[illegible] ста-
στάτός, ή, όν, які стаіць умясцоўлены, //нуць.
устаноўлены, пастаўлены.
σταυρός, ό, слуп проста пастаўлены; паля, сьпічастая паля або кол; палісада: плот або фортыфікацыя, узьніклая зь лініі калоў моцна асаджаных у зямлі і завостраных на версе як абарона перад інвазыяю; 2. крыж.
σταυρο-φάνής, ές, зьяўлены ў хворме крыжа; крыжападобны.

σταυρο-φόρος, ον, з крыжам /на/, абазначаны кры-
σταυρόω, кол, слуп а. палісады асаджваць у //жам.
зямлю; 2. укрыжоўваць, укрыжаваць; забіць, забіваць.
σταύρωμα, ατος, τό, пабудова палявога ўмацаваньня.
σταύρωσις, εως, ἡ, выпалісадаваньне; укрыжаваньне.
στᾰφίς, ἴδος, высушаная вінаградная ягада, разынка.
στᾰφῦλή, ἡ, гронка або кісьць вінаграду.
στᾰφῦλίς, ἴδος, ἡ, = σταφυλή.
στᾰφῦλο-κλοπίδης, ου, ὁ, вінаградны злодзей.
στάχυς, υος, ὁ, колас; жнізо; плод, семя; нашчад-
στέᾱρ, τό, сала, здор, тлушч; каламазь. //насьць.
στεγάζω, = στέγω. //няньне.
στεγάνη, ἡ, накрыцьце, накрываньне; аслона, асла-
στεγᾰνός, ή, όν, накрыты, акрыты, аслонены, ахіне-
στέγ-αρχος, ὁ, гаспадар дому. //ны.
στέγασμα, ατος, τό, кажная рэч, якая накрывае або
асланяе: дах, будан; памяшчэньне, кватэра.
στέγαστρον, τό, накрыцьце, закручаньне /ў паперу/.
στέγη, ἡ, дах; памяшчэньне, палатка, будан.
στεηνός, ή, όν, накрыты, закрыты.
στέγος, εος, τό, дах; памяшчэньне, дом, хата.
στέγω, накрываць, акрываць, бараніць, ахоўваць.
στείβω, утоптваць, таптаць, ступіць на, уступіць у.
στειλειά, ἡ, навылетная дзірка сакеры для тапарышча.
στειλεῖον, τό, тапарышча.
στεινό-πορος, ον, = στενόπορος.
στεινός, ή, όν, = στενός.
στεινότης, ἡ, = στενότης, ητος, ἡ, вузкасьць.
στεινόω, = στείνω.
στείνω, зьвязваць, зьвязаць. //сек.
στεῖρα, -ρη, ἡ, пярэдні моцны кіль вадаплаву; вада-
στεῖρος, α, ον, моцны, сільны, пругкі, адпорны.
στείχω, крочыць, хадзіць, ісьці, прыйсьці; выходзіць.
στελεόν, τό, = στειλειόν, ручка, тапарышча, тронак.
στελεόω, асадзіць ручку, тронак, тапарышча.
στέλεχος, τό, куст карэньняў, зь якога выходзяць
парасткі; аснова дрэва, пень.
στέλλω, прыводзіць у парадак, /у/парадкаваць, уладзіць, наладзіць; прыгатаўляць, вызначаць, вызначыць, высылаць, выслаць; быць гатовым /да вымаршу/; выходзіць, выйсьці; адбыв ць п д р жж ; руш ь /у падарож /; прывесьці /лека а ў дом/. //аліўная голька.
στέμμα, ατος, τό, павязка; вянок, венчык, карона;
στεμμᾰτόω, упрыгожыць вянком, істужкаю, гірляндаю.
στέμφῦλον, τό, выціснутая аліва, вінаград; жамерыны.
στέναγμα, ατος, τό, = στεναγμός.
στεναγμός, ὁ, стогн, стагнаньне, енк.
στενάζω, = ..ένω.
στεναῦχίζω, -ομαι, = στένω.

στενάχω, -ομαι, = στένω.
στενό-πορος, ον, з вузкім праходам.
στενός, ή, όν, вузкі. //клопат.
στένος, = στεῖνος, εος, τό, вускасьць, труднасьць,
στενότης, ή, вускасьць.
στενο-χωρέω, залюдніць; быць у цясноце; быць у бядзе.
στενοχωρία, ή, цяснота, вускасьць памяшчэньня; здабываньне жыльлёвае плошчы; вузкі праход; клопат; страх.
στενόω, рабіць вузкім, звужваць.
στενυγρός, ή, όν, вузкі.
στένω, кашляць, енчыць, вохкаць, уздыхаць, стагнаць; наракаць, голасна енчыць, лямэнтаваць.
στεν-ωπός, = στεινωπός, όν, учынены вузкім; вузкі.
στέργηθρον, τό, любоў-чароўнасьць; чар/оўнасьць/ любові; афэктацыя; любоўнае ўспрыняцьце; любоўнае аб'еднаньне; любоў.
στέργημα, ατος, τό, = στέργηθρον,.
στέργω, любіць, ахвотна мець; шанаваць, абагаўляць; быць сяброўскім; верна стаяць пры боку.
στερεός, ά, όν, пругкі, салідны /фізычна/; моцны, адпорны, непахісны; /стэрэотыпны, стэрэотып/.
στερεότης, ητος, ή, пругкасьць, стойкасьць, сталасьць, цьвёрдасьць, саліднасьць, непахіснасьць.
στερεό-φρων, ονος, ὁ, ή, пра характар: непахісны, сталы.
στερεόω, рабіць цьвёрдым, непахісным, моцным.
στερέω, /а/грабіць, забіраць; пазбавіць.
στερέωμα, ατος, τό, моцнае цела; аснова, фундамэнт; непахіснасьць, непарушнасьць; нябесны фірмамэнт.
στερεῶς, прысл. стойка, моцна, стала.
στέρνον, τό, грудзі; у зн. пер. - сэрца.
στερνοτῦπία, ή, біцьце, удырваньне сябе ў грудзі ў
στερν-οῦχος, ον, шырокагруды. //хвіліну нядолі.
στέρομαι, быць аграбленым або пазбаўленым /маемасьці/; стацца аграбленым; згубіць.
στεροπή, ή, = ἀστεροπή, = ἀστραπή, бліск маланкі, маланка, пярун; іскра, бліск; мігаценьне сьвятла.
στεροπ-ηγερέτᾶ, ὁ, кідальнік маланкі, пяруна.
στέροψ, οπος, ὁ, маланка, пярун.
στερρός, ά, όν, пругкі, непахісны, салідны, моцны; цьвярды, каменны.
στεῦμαι, ставіць сябе на месца; рабіць уражаньне ахвочасьці рабіць н.; адважыцца на н.
στεφάνη, ή, = στέφᾰνος.
στεφανηπλοκέω, плесьці вянок.
στεφᾰνηφορέω, насіць вянок а. ґірлянду ці істужку.
στεφᾰνηφορία, ή, нашэньне вянка перамогі; 2. права нашэньня кароны.
στεφᾰνη-φόρος, ον, увенчаны, упрыгожаны вянком.

στεφᾰνίτης, ου, ὁ, = στεφᾱνηφόρος.
στέφᾰνος, ὁ, тое, што акружае: вянец на галаву, вянок, карона; вянок пераможніка на публічных спаборніцтвах; вянец перамогі; персьцень; узнагарода.
στεφᾰνόω, увенчаць; ускласьці вянок а. карону; упрыгожыць, увянчаць; туга сьцягнуць асабліва навакол.
στεφᾰν-ώδης, ες, як вянок а. карона; абкручаны, а-
στεφάνωμα, ατος, τό, тое, што абкружвае: //пасаны.
вянок, карона; узнагарода за перамогу.
στέφος, εος, τό, = στέφᾰνος, вянок, ґірлянда; галіна, голька.
στέφω, = στεφανόω.
στηθο-μελής, ές, пяяны, сьпяваны грудзьмі.
στῆθος, εος, τό, грудзі; /стэтоскоп/.
στήκω, стаяць моцна; аставацца стойкім.
στήλη, = στάλα, ἡ, проста пастаўлены камень, помнік; каменны слуп; інскрыпцыя на слупе.
στηλίδιον, τό, памянш. ад στήλη, малы помнік, малая стэла, малая калёна.
στήμων, ονος, ὁ, аснова ў /вэртыкальных/ кроснах; нацягнутыя ніткі.
στηριγμός, ὁ, апора, падпора, падтрымка; пругкасьць.
στῆριγξ, ιγγος, ἡ, падтрымка, апора, падпора; стой.
στηρίζω, сьцьвердзіць, падцьвердзіць, устанавіць; быць абапертым.
στήτη, або στήτα, ἡ, дор. зам. γυνή.
στιβαρός, ά, όν, туга сьціснуты, шчыльны, моцны, мускулісты, магутны.
στιβάς, αδος, ἡ, цьвёрдае пасланьне; пасьцель з саломы або лісьця; сеньнік, матрац.
στῐβέω, высьледзіць; перашукаць.
στίβη, ἡ, замерзлая раса́, іней.
στίβος, ὁ, вытаптаная дарога, сьцежка, вуліца.
στῐγεύς, έως, ὁ, выпальшчык знаку; выпальнік /пры-
στίγμα, ατος, τό, пункт, укол, удыр; знак, //лада/.
выпалены знак, азнака, кляймо; знак распазнаньня; знак
στιγμᾰτηφορέω, мець а. насіць знак. //ганьбы.
στιγμᾰτίας, ου, ὁ, нявольнік або праступнік з выпаленым знакам.
στιγμή, ἡ, пункт; месца ўколу /укусу/; знак, азнака; зацема; стыґмат, /стыґматычны/; пра час: мамэнт.
στίζω, пракалоць, укалоць, выпаліць знак, кляймо, таўро; татуаваць /анг. to tattoo/.
στικτός, ἡ, όν, уколаты, азначаны, выпалены.
στιλβότης, ητος, ἡ, ґлянц.
στίλβω, ґлянцаваць, выґлянцаваць.
στίλη, ἡ, капля.
στιλπνός, ἡ, όν, выґлянцаваны, бліщчусты.
στίξ, στίχος, ἡ, рад, лінія; рад/ок/, верш.

στῖφος, εος, τό, шчыльна напханая рэч; шчыльная маса; натоўп, калёна.
στῐχάω,=στῐχάομαι, ісьці шчыльным радам; на лініі або ў баёвым парадку ісьці.
στῐχίδῐον, τό, малы верш, вершык.
στῐχο-γράφος, ον, напісаны верш. //напісанага вершу.
στίχος, ὁ, рад /дрэваў/, лінія /жаўнераў/; радок
στοά / στοιά/ ᾶς, ἡ, стоа, /мн.л. стоа/, калёнавая заля; ґалярэя з калёнамі; у Атэнах ποικίλη στοά з размалёванымі сьценамі Поліґнотосам; згэтуль /са слова стоа/ выводзіцца назоў прыхільнікаў філёзафа Зэнона - οἱ στωικοί: стоікі; ἡ βασίλειος або τοῦ βασιλέως στοά ў Атэнах на рынку; у ёй прамаўляў архонт βασιλεύς, згэтуль агалошваліся новыя правы.
στοιβάς, άδος, ἡ = στιβάς.
στοιβή, ἡ, пакульле; устаўное слова, выражэньне.
στοιχεῖον, τό, літара; мн.л. альфабэт, абэцэда; найпрасьцейшая падставовасьць, падстава; падстава пачатку; элемэнтарнасьць, рудымэнтарнасьць; сонечны га-
στοιχειώδης, ες, элемэнтарны, просты. //дзіньнік.
στοιχέω, стаяць, стануць, стаяць гатовым да бою.
στοιχηγορέω, учарговасьці без перапынку лічыць.
στοιχίζω, паставіць у рад слупы з сеткаю /каб заганяць зьвярыну/; ставіць у парадак /у рады/.
στοῖχος, ὁ, = στίχος.
στολ-άρχης, ου, ὁ, камандзір флёты, адмірал.
στολάς, άδος, ἡ, = σπολάς.
στολή, ἡ, вопратка, касьцюм, рызьзё, адзежа; 2. доўгая туніка з рукавамі.
στολῐδόω, -ομαι, нешта апрануць /накінуць/ на сябе.
στολίδωμα, ατος, τό, хвалда вопраткі.
στολῐδωτός, ή, όν, схвалдаваны.
στολίζω, = στέλλω.
στόλιον, τό, малая вопратка. //це.
στολίς, ίδος, ἡ, складка; вопратка, адзежа, акрыць-
στόλισμα, ατος, τό, гарнітур; вопратка, адзежа,
στολμός, ὁ, вопратка, адзежа, сукенка. //мантыя.
στόλος, ὁ, падарожжа, язда, ход, хада, спацыраваньне; /вы/марш, паход, выправа /ваенная/, экспэдыцыя.
στόμα, ατος, τό, рот, вусны; твар; пра зьвераў: пашча, зяпа, морда, рыла, дзюб, нос /рыбы/; язык, зубы; мова, слова, гаворка; працэс вымаўляньня словаў; адкрыцьце, закрыцьце; /стоматолёґія/.
στόμ-αργος, ον, пляткарскі, языкаваты, зласьлівы на язык, крыклівы; мардаты.
στόμαχος, ὁ, вусны, рот, адкрыцьце, глытаўка, горла, ежавае горла; страўнік.
στόμιον, τό, паменш. ад στόμα.
στομόω, запхаць рот; зачыніць, зачыніць вусны.

στομφάζω, гаварыць напышліва; дэклямаваць. //мовы.
στόμφαξ, ᾶκος, ὁ, высокамоўнасьць, напышанасьць
στόμφος, ὁ, выняткава ўзвышаная фраза /сказ, мова/.
στόμωμα, ατος, τό, гарт, сіла, моц, магутнасьць.
στόμωσις, εως, ἡ, наданьне вастрыя рэчы; гартаваньне жалеза ў сталь; у мове: вострасьць языка.
στονᾰχέω, = στένω.
στονᾰχή, ἡ, = στόνος.
στόνος, ὁ, стагнаньне, енк, лямэнтаваньне.
στοργή, ἡ, далікатная любоў; натуральная далікатная любоў бацькоў і дзяцей.
στορέννῡμι, скар. στόρνῡμι, расьцягваць, расьцягнуць; распашырыць, распаўсюджваць.
στόρνῡμι, пазьн. хв. στορέννῡμι.
στοχάζομαι, мэціцца а. стрэліць у мэту, папасьці ў мэту; прасьледваць мэту, імкнуцца да мэты.
στόχασμα, ατος, τό, дроцік, страла. //мэту.
στοχαστικός, ή, όν, здольны трапіць а. папасьці ў
στόχος, ὁ, пастаўленая мэта; угад; трапнасьць.
στραγγάλη, ἡ, вяроўка, пастронак; пятля; канат.
στραγγεύομαι, скручваць, зьвіваць; абярнуцца нава-
στραγγ-ουρία, ἡ, затрыманьне, затрымка //кол.
мочы /урыны/; хвараблівая труднасьць адданьня мочы.
στραγγ-ουριάω, цярпець з прычыны труднасьці адданьня мочы. //капля.
στράγξ, ἡ, тое, што памалу выцякае а. выціскаецца,
στράπτω, бліснуць, запаліць. //вадзе.
στρᾰτάομαι, затрымацца ў вадзе, жыць а. прабываць у
στρᾰτ-άρχης, ου, ὁ, стратэг, маршалак польны, гэнэ-
στρᾰτ-αρχος, ὁ, = στρατάρχης. //рал.
στρατάω, = στρατάομαι.
στρᾰτεία, ἡ, ваенная выправа, паход на вайну; экспэдыцыя; ваенная служба.
στράτευμα, ατος, τό, /ваенная/ выправа; экспэдыцыя; узбраеньне; армія. //бовы; здольны да ваеннае службы.
στρᾰτεύσιμος, ον, прыналежны да ваеннае службы; служ-
στράτευσις, ἡ, = στρατεία.
στρᾰτεύω, ісьці на вайну, браць удзел у ваеннай вы-
στρατεύομαι, = στρᾰτεύω. //праве; служыць у часе в.
στρᾰτηγέω, быць стратэгам або гэнэралам.
στρᾰτήγημα, ατος, τό, чын гэнэрала; ваенная здольнасьць; ваенная хітрасьць.
στρᾰτηγία, ἡ, стратэґія, кваліфікацыі гэнэрала; урад; штаб гэнэрала, галоўная кватэра.
στρᾰτηγιάω, жадаць сабе быць гэнэралам. //ны.
στρᾰτηγἴκός, ή, όν, свомы для стратэґа; стратэгіч-
στρᾰτήγιον, τό, будан або цэльт стратэґа ці галоўная кватэра гэнэрала. //рал.
στρᾰτ-ηγός, ὁ, камандзір; гэнэрал, стратэг, адмі-

στρατηΐη, ἡ, іён. для στρατεΐα. //пэдыцыя; армія.
στρᾰτηλᾰσΐα, ἡ, ваенная выправа а. кампанія; экс-
στρᾰτηλᾰσΐη, ἡ, = στρᾰτηλᾰσΐα. //гам.
στρᾰτηλᾰτέω, весьці армію на поле бою; быць стратэ-
στρᾰτηλᾰτης, ου, ὁ, камандзір арміі, гэнэрал.
στρᾰτιά, ἡ, армія, рота; узбраеньне; сіла арміі.
στρᾰτΐ-αρχος, ὁ, = στρατάρχης. //вы.
στρᾰτιος, ον, прыналежны да арміі; ваенны, вайско-
στρᾰτιώτης, ου, ὁ, грамадзянін на вайсковай службе,
στρᾰτιωτικός, ἡ, όν, вайсковы, ваенны. //ваяр.
στρατιωτικῶς, прысл. па-жаўнерску, як жаўнер.
στρᾰτιωτΐς, ΐδος, жанчына жаўнер; στρατιωτΐς, ἡ, вадаплаў-транспартовец для перавозу войска.
στρᾰτο-λογέω, зьбіраць войска, рэкрутаваць; стаць ца жаўнерам. //міі.
στρᾰτό-μαντις, εως, ὁ, прадказальнік, прарок ар-
στρᾰτοπεδ-άρχης, ου, ὁ, камандзір каралеўскае /кайзэра, прэтора - Рым/ стражы.
στρᾰτο-πεδεΐα, ἡ, = στρᾰτοπέδευσις.
στρᾰτο-πέδευσις, ἡ, стаянка ў вабозе; разьбіцьцё абозу; месца абозу; абоз.
στρᾰτοπεδεύω, стануць а. стаяць абозам, разьбіць лягер; пра вадаплаў: плысьці, кіравацца на месца закатвіджаньня; закінуць катвігу; заняць пазыцыю.
στρᾰτόπεδον, τό, абшар заняты абозам; бівак.
στρᾰτός, ὁ, стан, лягер; армія на пастою; армія; войска.
στρέβλη, ἡ, прылада для накручваньня, брашпіль, шрубавы прэс, ціск;2. прылада для тартураваньня.
στρεβλός, ἡ, όν, выкручваць, выгінаць, зьнявечыць.
στρεβλόω, мучыць; зламаць, зьвіхнуць, выкручваць.
στρέμμα, ατος, τό, тое, што выкручваецца; расьцягваньне, вывіхненьне.
στρεύγομαι, быць выкручаным а. вывіхнутым: быць вычэрпаным з сілы; быць вымучаным; быць зжытым.
στρεφε-δινέω, круціць, круціць навакол; быць кручаным.
στρέφω, выкручваць, круціць, выгінаць; выкручвацца, круціцца, выгінацца; вандраваць навакол.
στέφις, εως, ἡ, кручэньне, выкручваньне.
στρεφο-δΐκΐω, перакручваць, выкрыўляць а. тэндэнцыйна імпрэтаваць права.
στρεφοδΐκο-πᾰνουργΐα, ἡ, хітра-подласьць у інтэрпрэтацыі справядлівасьці.
στρηνής, ές, суворы, храпаваты, жорсткі, прыкры.
στρηνιάω, быць заўзятым; жыць раскошна ў дастатку.
στρῆνος, τό, сіла, магутнасьць; раскоша, люксус.
στρΐζω, пранізьліва крычаць, крычаць ґвалт.
στροβέω, віраваць, круціць навкол; 2. несупакоіць.
στροβητός, ἡ, όν, кручаны, кружаны навакол.

στροβῑλίζω, выкручваць, выкруціць. //хар, вір.
στρόβῑλος, ὁ, кажная рэч, што круціцца а. віруе, ві-
στρόβος, ὁ, рух навакол; вір.
στρογγύλλω, рабіць круглым; закруціць, віраваць.
στρογγύλος, η, ον, закруглены, круглы.
στρομβέω, віраваць навакол.
στρόμβος, ὁ, вір, віхор; круцёлка; кажная рэч, што круціцца навакол.
στρουθίον, ου, τό, малады верабей, верабейчык, верабянё; маладая птушка, птушанё.
στρουθός, ὁ, ἡ, малая /маладая/ птушка, верабянё.
στροφάλιγξ, ιγγος, ἡ, вір; самакручэньне, абяр-
στροφᾰλίζω, хутка круціць /верацяно/. //таньне.
στροφάς, άδος, ὁ, ἡ, віраваньне, абяртаньне.
στροφεῖον, τό, катвіжны калаўрот.
στροφή, ἡ, кручэньне, абяртаньне; 2. хітрасьць.
στρόφιγξ, ιγγος, ὁ, ἡ, пункт абяртаньня; шып, вось.
στρόφιον, τό, малая істужка а. апаска ношаная на га-
στροφίς, ίδος, ἡ, = στρόφιον. //лаве.
στροφοδινέω, = στρεφεδινέω.
στρόφος, ὁ, вяроўка, канат; 2. істужка, тасьма.
Στρῡμών, όνος, ὁ, гранічная рака між Тракіяю і Македоніяю. //горле.
στρυφνός, όν, кіслы, горкі, церпкі, які дзярэ ў
στρυχνίνη, ἡ, стрыхніна; атрутнае рэчыва.
στρύχνος, ὁ, цень ночы; 2. стрыхнос, род расьліны, зь якое атрымліваецца атрута сільнага ўзьдзеяньня.
στρῶμα, ατος, τό, кажная распасьцертая рэч для ляжаньня а. сядзэньня: ложак, матрац. //лім.
στρωμνή, ἡ, ложак, пасланьне; матрац; радзюжка, кі-
στρωφάω, стала круціць, падтрымліваць кручэньне; круціцца.
στῠγερός, ά, όν, /зь/ненавіджаны; поўны агіды.
στῠγερ-ώπης, ες, спагляданы зь нянавісьцю; напоўнены нянавісьцю.
στῠγέω, ненавідзець, чуць агіду да; чыніць страшным, палохаць; палохацца.
στύγημα, ατος, τό, аб'ект ненавісьці; агіда.
στυγνάζω, быць сумным.
στυγνός, ή, όν, зьненавіджаны, пагарджаны; сумны, пануры, страшны, цёмны, няшчасны.
στυγνότης, ητος, ἡ, панурае /цёмнае/ існаваньне; сум, засмучаньне, сумнасьць; боль.
στυγνόω, рабіць сумным або панурым; быць сумным.
στύγος, εος, τό, ненавісьць, агіда.
στῦλος, ὁ, калёна; слуп, шула.
στυλόω, узмоцніць калёнамі, слупамі.
Στύξ, ῠγός, ἡ, Стыкс, рака падзямельнага сьвету гора і ненавісьці.

στύπη, ἡ, галяўнічы канат выраблены зь лёну і канап-
στυπτηρία, ίη, ἡ, жалезны а. зялёны купарвас. //лі.
στυπτήριος, α, ον, вязальны, змацавальны,сшывальны, інтраліґаторскі.
στῦφελιγμός, ὁ, удыраньне, удырваньне, біцьцё, тузаньне, папіханьне, ходаньне, таройканьне. //ўдыр.
στῦφελίζω, удыраньне, пханьне, тузаньне, сільны
στῦφελός, ἡ, όν, густы, цьвярды, моцны, жорсткі.
στῦφο-κόπος, ον, удыраны палкаю.
στύφω, сьцягваць, сьцягнуць разам; згушчваць, згусьціць, рабіць тугім.
στωά, ἡ, дар. для στοά.
Στωικός, ὁ, стоік.
Στωικός, ἡ, όν, стоіцкі, як стоік.
στωμῦλία, ἡ, гаварлівасьць, гутаркавасьць, чаўпня; пляткарства; плётка.
στωμῦλιο-συλλεκτάδης, ου, ὁ, чаўпня, гутаркавасьць, зьбіраньне шумавіньня, прагнасьць плётак.
στωμύλλω, быць гаворкім, гутарлівым; гаварыць дыскутаваць, весьці канвэрсацыю.
στῶμυλμα, ατος, τό, = στωμυλία, чаўпня.
στωμύλος, ον, гаворкі, пыскаты, пляткарскі.
σύ, ты; /узмоцненае σύγε і σύπερ/.
συ-αγρεσία, ἡ, паляваньне на дзіка.
σύ-αγρος, ὁ, паляўнічы на дзіка.
σῦβἄριζω /і Σῦβἄρίζω/, жыць як сыбарыта, жыць у раскошы, у люксусе.
Σύβἄρις, εως, ἡ, Сыбарыс, места ў гр. калёніі ў паўдз. Люканіі ў ніжняй Італі.
Σῦβἄρῖται, οἱ, жыхары места Сыбарыс.
σῦ-βόσιον і σῦ-βόσειον, τό, гурт а. стада сьвіньней.
σῦ-βότης, ου, ὁ, сьвінапас.
σύγ-γἄμος, ον, зьвязаны жанімствам. //меяць.
συγ-γελάω, сьмяяцца з або разам; высьмейваць, высь-
συγγένεια, ἡ, сваяцтва, радня; мн. л.: сям'я, сваясυγ-γενής, ές, сународжанны, /на/роджаны ра- //кі.
зам; духова блізкі, натуральны, конґэніяльны; адыстар.
συγγενικός, ἡ, όν, суродны, сваяцкі, зроднены.
συγγενικῶς, прысл. як сваяк, суроднена, па-сваяцку.
συγ-γέρων, οντος, ὁ, сябра, стары сябра /сярод людзей старшага веку/.
συγγεωργέω, быць сябрам а. таварышам фізычнае працы.
συγ-γεωργός, ὁ, сябра польнае працы.
συγ-γηθέω, радавацца з або разам.
συγ-γηράσκω, старэцца разам з.
συγγιγνομαι, быць з; утрымліваць а. падтрымліваць суадносіны ці зносіны; сябраваць з; жыць з; утрымліваць сэксуальныя зносіны; гутарыць з; прыйсьці з помаччу; зыйсьціся разам, спаткацца.

συγ-γιγνώσκω, мець супольны пагляд або быць аднае думкі з; усузгодніць; згаджацца, згадзіцца; узнаць, выразіць узнаньне; уступіць; даравaць.
σύγγνοια, ἡ = συγγνώμη.
συγγνώμη, ἡ, даравaньне, выбачэньне, ласка; дозвол.
συγγνωμονέω, выбачыць, даравaць; дазволіць.
συγγνωμονικός, ἡ, όν, даравaны, абдораны даравaньнем; схільны даравaць; паблажлівы, памяркоўны, спагадлівы.
συγγνωμοσύνη, ἡ, сяброўскае пачуцьцё, даравaньне, непамятаньне крыўды.
συγγνώμων, ον, абдораны, даравaны, вольны ад віны; схільны даравaць; даравaльны.
συγγνωστός, ἡ, όν, абдораны /ласкаю/; даравaны; схільны даравaць.
σύγ-γονος, ον, = συγγενής.
σύγγραμμα, ατος, τό, напісаньне, упісаньне, запісаньне; пісаная праца, пісаны твор.
συγγραμμάτιον, τό, малое пісаньне, малая кніжка, кніжыца.
συγγραφεύς, έως, ὁ, пісьменьнік, гісторык, гісторыяграф; пісьменьнік у прозе.
συγγραφή, ἡ, тое, што напісана а. запісана: кніжка, кніга; гісторыя; умова, кантракт.
συγγραφικός, ἡ, όν, запісаны, пераказаны гісторыі.
συγγράφω, запісаць, напісаць, упісаць, стварыць працу.
συγ-γυμνάζω, вывучаць, вучыцца разам, супольна.
συγγυμναστής, οῦ, ὁ, сябра ў фізычных практыкаваньнях.
σύγε, = σύ.
συγ-καθαιρέω, цягнуць а. сьцягваць разам.
συγ-καθέζομαι, сядзець з або разам.
συγ-καθεύδω, з або разам спаць.
συγ-καθίζω, садзіць або сесьці разам.
συγ-κακοπαθέω, разам цярпець.
συγ-κακουχέομαι, разам зносіць няволю, цярпеньне.
συγ-καλέω, склікваць, клікаць разам; склікаць веча.
συγ-καλύπτω, зусім пакрыць, закрыць а. асланіць.
συγ-κάμνω, супрацаваць, разам працаваць.
συγ-κάμπτω, сагнуць разам, сагнуць.
συγ-κασιγνήτη, ἡ, сястра /некаму/.
συγ-κάσις, ιος, ὁ, ἡ, /некаму/ брат ці сястра.
συγ-καταβαίνω, разам крочыць; разам імкнуцца да мэты.
συγ-καταγηράσκω, разам зь н. старэцца або стацца старым.
συγ-καταδιώκω, аднaчасна прасьледаваць, ісьці за.
συγ-καταδουλόω, злучыцца ў прадмеце паняволеньня.
συγ-καταθάπτω, аднaчасна а. разам пахаваць.
συγκατάθεσις, ἡ, умова, пагадненьне, апрабата.
συγ-καταθέω, рабіць напад зь іншым.
συγ-καταθνήσκω, паміраць разам з.
συγ-καταίθω, зь іншым спаліць да тла.

συγ-καταινέω, згаджацца зь н.
συγ-κάταινος, ον, згодны, узгоднены.
συγ-κατακαίω, -κάω, спаліць разам зь іншым.
συγ-κατάκειμαι, разам за сталом узълежваць а. сядзець.
συγ-κατακτείνω, забіць разам.
συγ-καταλείπω, пакінуць разам зь ін.
συγ-καταμίγνῡμι, зьмяшчацца з; умяшчацца. //ваць.
συγ-καταπλέκω, умешвацца /у справу/, інтэрвэнія-
συγ-καταπράττω, праяўляць зычлівасьць, ласкавасьць; гадзіцца зь іншымі.
συγ-καταρρίπτω, зваліць разам зь іншымі а. суцэльна.
συγ-κατασκάπτω, разам зь іншымі зьнішчыць, разваліць або загінуць.
συγ-κατασκευάζω, разам падрыхтаваць, спрычыняць, памагаць у чыненьні або выканаць. //ваць.
συγ-κατασπάω, разам сьцягнуць уніз; памагаць сьцяг-
συγ-κατατάσσω, разам уладзіць.
συγ-κατατίθεμαι, разам або гэтаксама са свайго боку ўставіць; згаджацца, даць згоду; быць у суэгодзе.
συγ-καταψεύδομαι, далучыцца ў хлусьні супроць н.
συγ-κατέρχομαι, разам прыйсьці а. разам вярнуцца.
συγ-κατεσθέω, разам зь іншымі жэрці.
συγ-κατηγορέω, разам абвінавачваць.
συγ-κατοικέω, жыць разам /у памешканьні/.
συγ-κατοικίζω, асесьці на жыльлё разам зь іншымі, разам калёнізаваць.
συγ-κατοικτίζομαι, /су/спаўчуваць, бедаваць разам.
συγ-κατορύττω, -σσω, разам /супольна/ пахаваць.
συγ-καττύω, папра віць, залатаць, аднавіць.
σύγ-κειμαι, злажыць разам, быць разам; разам злажыць; выпрацаваць, стварыць /верш/; вызначыць; згадзіцца.
συγ-κελεύω, падтрымаць дамаганьне.
συγ-κεντέω, пракалоць /закалоць/ а.пранізаць разам.
συγκεράννῡμι або -ύω, зьмяшацьць, зьмяшацца разам; цесна злучыцца а. зьвязацца; аб'еднацца. //ным.
συγ-κεραυνόω, удырыць пяруном; быць пяруном удыра-
συγ-κεφᾰλαιόω, зьвесьці ў суму: зьлічыць, падлічыць.
συγ-κινδῡνεύω, аднача сна быць у небясьпецы; трапіць разам у бяду; дзяліць нядолю. //піхацца.
συγ-κῑνέω, рухацца ў тузаніне; тузацца, ходацца, па-
συγ-κλάω, трасьціся разам; разваліцца, рассыпацца.
σύγκλεισις, εως, ἡ, злучэньне, ушчыльненьне; цеснае аб'еднаньне; цесната, цяснота.
συγ-κλείω, ушчыльніць /рады/; ушчыльніцца; цесна ўшчыльніцца, цесна злучыцца; хвармаваць закрытае кола.
συγ-κλέπτω, разам красьці.
σύγ-κληρος, ον, аднолькавае долі зь іншым/і/.
συγ-κληρόω, вызначыць аднолькавую долю; агарнуць аднолькавою доляю.

συγ-κλησις, εως, ἡ, = атт. σύγκλεισις.
συγκλητῖκός, ή, όν, прыналежны да рымскага сэнату; сэнатарскі; 2. - ὁ, сэнатар.
σύγκλητος, ον, склікаыы разам, паклікаыы.
συγκλῄω, = συγκλείω.
συγκλινία, ἡ, сустрэча пахіласьцяў, дэфіляў або цясьнінаў. //бач некага.
συγ-κλίνω, сукланяць, пахіляць да сябе; ляжаць по-
συγ-κλονέω, /па/трасьці разам, устрасянуць разам; узносіць, узьнесьці закалот.
συγ-κλύζω, заліваць, заліць; разьліцца паводкаю.
σύγ-κλῦς, ῦδος, разам змыты хвалямі.
συγκοίμημα, ατος, τό, супольнае ложа або спаньне; 2. удзельнік супольнага ложа, сужанец.
συγκοίμησις, ἡ, супольнае спаньне.
συγ-κοιμίζω, класьціся а. легчы ў ложак разам.
συγκοινωνέω, мець супольны ўдзел у.
συγ-κολλάω, склеіць разам.
σύγ-κολλος, ον, склееныы разам.
συγκομῐδή, ἡ, скліканьне разам.
συγ-κομίζω, зьнесьці разам, зносіць, прыносіць.
συγκοπή, ἡ, пакроеньне, пасечаньне на дробныя част-
συγ-κόπτω, разьбіць, пасекчы. //кі.
σύγκρᾶσις, εως, ἡ, /зь/мяшаньне разам, мяшаньне /субстанцыя/; стопленьне; сумесь.
συγ-κρᾰτέω, трымаць разам; узьдзейваць.
σύγκρᾱτος, ον, зьмяшаны разам.
συγ-κρίνω, скласьці, злучыць разам.
σύγκρῐσις, ἡ, злажэньне разам; зьмяшаньне; кампазыцыя; 2. параўнаньне. //наўчы, сынкрытычны.
συγκρῐτῐκός, ή, όν, злучаны, зложаны разам; параў-
συγ-κροτέω, удырваць разам, разам каваць; зьбіваць разам; 2. быць добра трэнаваным. //дзе.
σύγκρουσις, εως, ἡ, судыраньне; сварка, разладзь-
συγ-κρούω, біцца; давесьці да судыраньня.
συγ-κρύπτω, схаваць суцэльна, укрываць, хаваць.
συγ-κτάομαι, здабыць разам, памагаць здабыць.
συγ-κτίζω, разам зь н. выбудоўваць, будаваць.
συγκτίστης, ου, ὁ, супрацоўнік у пабудове.
συγ-κῠβεύω, гуляць з к.-н. у косьці.
συγ-κῠνᾱγός, ἡ, сябра ў паляваньні.
συγ-κυνηγός, ὁ, сябра ў паляваньні.
συγ-κυνηγετέω, разам паляваць.
συγ-κύπτω, разам нагінацца наперад; узаемна /разам/ набліжацца.
συγ-κῠρέω, зь н. судырыцца; зь н. прыпадкава спатыкацца; здарыцца ў тым самым часе.
συγκύρημα, ατος, τό, спатканьне, выпадак, здарэньне.

συγκυρία, ἡ, здарэньне, зьбег абставінаў.
συγ-κωμάζω, ісьці разам на κῶμος; прыймаць удзел у ўрачыстай працэсыі. //ду.
σύγκωμος, ὁ, удзельнік урачыстае працэсыі а. пахо-
συγ-χαίρω, сурадавацца, радавацца супольна зь іншымі.
συγ-χέω, зьліваць разам, зьмешваць; прыводзіць у непарадак; зьбянтэжыцца; папасьці ў супярэчнасьць; зьніш-
συγχορευτής, οῦ, ὁ, сутанцор у танцу. //чыць.
συγ-χορέω, танцаваць з або разам.
συγ-χορηγέω, памагаць у абесьпячэньні; падтрымліваць, падтрымаць. //ваць.
συγ-χόω, перасыпваць, прасыпваць; засыпаць, заваль-
συγ-χράομαι, разам ужываць; разам тасаваць.
συγ-χύν/ν/ω, = συγχέω. //чэньне.
σύγχυσις, εως, ἡ, зьмяшаньне; закаламучаньне; зьніш-
συγ-χωνεύω, стапіць /воск/ разам; расплаўліваць, расплавіць.
συγ-χωρεύω, стапіць /мэтал/ разам.
συγ-χώννυμι, = συγχόω.
συγ-χωρέω, ісьці разам; злучыцца; зыйсьціся разам; аб'еднацца; ісьці на згоду, згадзіцца, згаджацца.
σύδην, прысл. пасьпешна, хутка, жыва.
σύειος, α, ον, сьвіны, сьвінячы.
συ-ζάω, жыць з або разам.
συ-ζεύγνυμι, разам сьцягнуць /гуньку/; разам упрэгчы; пра маладую пару: пабрацца.
σύζευξις, εως, ἡ, злучэньне, камбінацыя.
συ-ζητέω, разам дасьледзіць а. правесьці справу.
συζήτησις, εως, ἡ, дыскусыя, дыялёг, дыскурс.
συζητητής, οῦ, ὁ, вучоны дыскутант, удзельнік дыспуты, учасьнік суменснага досьледу; сафісты.
συζυγία, ἡ, злучэньне, спражэньне /коней/; аб'еднаньне; 2. ярмо, пара /валоў/. //зам.
συζύγιος, α, ον, спрэжаны, злучаны, запрэжаны ра-
σύζυγος, ον, запрэжаны ў ярмо; пад'ярэмны; - ὁ, сябра, супрацоўнік; - ἡ, жонка, супрацоўніца.
συ-ζώννυμι, разам апаясаны; апаясваць.
συ-ζωοποιέω, пасьпець на той самы час.
συκάμινον, τό, тутавая /шаўкаўнічная/ ягада.
συκάμινος, ἡ, тутавае /шаўкаўнічнае/ дрэва.
συκίδιον, τό, малая фіґа.
συκίζω, жырэць на фіґах. //фіґі; фіґавы.
σύκινος, η, ον, прыналежны да фіґавага дрэва ці
σύκινον ξύλον, драўляны матэрыял з фіґавага дрэва.
συκίς, ίδος, ἡ, парастак фіґавага дрэва; маладое
συκολογέω, абіраць з дрэва фіґі. //фіґавае дрэўца.
συκό-μορος, ἡ, сікамора, фіґашаўковае дрэва /ягі-
σῦκον, τό, фіґа. //пецкі сорт/.
συκο-τράγέω, есьці фіґі.

συκοτρᾰγίδης, ου, ὁ, ласун фіґаў.

σῡκοφαντέω, быць сыкофантам а. зласьлівым паклёпнікам; быць даношчыкам; хвальшыва абвінавачваць, абгаварваць.

σῡκοφάντημα, ατος, τό, хвальшывае абвінавачаньне, ачарняньне; місрэпрэзэнтацыя.

σῡκοφάντης, ου, ὁ, той, хто трасе фіґавае дрэва /атрасае фіґі/; 2. фіґавы даносчык /хто даносіць пра факт вывазу фіґаў з Аттыкі/; 3. даносчык, інфарматар; 4. хвальшывы абвінаваўца; 5. паклёпнік; /Пол., 340 /.

σῡκοφαντία, ἡ, сыкофанцыя, манія сыкофанта: абгаварваць, ачарняць, пляткаваць, даносіць.

σῡκοφαντικός, ή, όν, як сыкофант, сыкофантычны.

σῡκοφαντρία, ἡ, сыкофантка.

συκόφᾰσις, εως, ἡ, = σῡκοφαντία.

συκοφορέω, насіць, несьці фіґі.

συκόω, карміць фіґамі.

σῡλᾰγωγέω, забраць чужое; /у/красьці; акрадаць; 2. рабаваць; забіраць як ваенную здабычу; весьці палонных.

σῡλάω, зьдзіраць аружжа з забітага ворага; аграбіць; быць аграбленым; нішчыць чужое дабро; забіраць.

σῡλεύω, украсьці, абакрасьці патайком; ашукаць, выманіць.

σύλη, ἡ або σῦλον, τό, ужываныя ў мн.л.: σῦλαι, οἱ або σῦλα, τά, права забраньня, захопу або рэквізыцыі вадаплаву ці грузу замежнае флятылі; права захопу або права рэпрэсыі ў часе вайны.

σῡλητήρ, ηρος, = σῡλήτωρ, ρος, ὁ, грабежнік.

σῡλήτειρα, ἡ, грабежніца.

υλλᾱβ´, , тое, шт трым е р зам; грам.: сыльляба, склад.

συλλαβίζω, чытаць па складох, сыльлябізаваць.

συλλᾰλέω, весьці гутарку, дыялёг, дыскусыю.

συλ-λαμβάνω, забраць, грабіць; злучыць, далучыць /да цэласьці/; /су/зграмадзіць; закрыць вочы і рот /нябожчыка/; захапіць /у палон/, забраць з сабою.

συλ-λέγω, разам чытаць; разам шукаць, кіраваць, весьці, несьці, зьбіраць; стаца пакліканым; суэграмадзіцца.

σύλ-λεκτρος, ὁ, ἡ, супольнік ложа: жонка, муж.

συλλήβδην, прысл. агульна кажучы, у суме; наагул.

συλλήπτρια, ἡ, памочніца, асыстэнтка.

συλλήπτωρ, ορος, ὁ, памочнік, асыстэнт.

σύλληψις, εως, ἡ, уняцьце, агарненьне, кемнасьць; ахапка, добрае ўзяцьце; захопленьне ў палон; арыштаваньне.

συλλογή, ἡ, зграмаджэньне, сход; вэрбаваньне а. набіраньне рэкрутаў.

συλ-λογίζομαι, зьлічыць усё разам; падлічыць, падсумаваць; думаць, разважаць, разважыць; прыйсьці да выснаву.

συλλογίμαῖος, α, ον, зграмаджаны з розных месцаў.

συλλογισμός, ὁ, выснаў разумаваньня а. разумовага працэсу; вынік лягічнага разважаньня; сыльлёґізм.

σύλλογος, ὁ, зграмаджэньне, сход:, веча; ассамблея, мітынґ; народ; прысутнасьць інтэлекту.
συλλοχίτης, ου, ὁ, жаўнер таго самага лохосу.
συλ-λῡπέω, разам клапаціцца, турбавацца; спаўчу- //ваць.
σῦλον, τό, = σύλη.
σῦμα, τό, = θῦμα.
συμ-βαίνω, ісьці ў ногу, ісьці разам; прыбыць адначасна; згаджацца, дамаўляцца; датарнавацца; выснаў.
συμ-βακχεύω, браць удзел у сьвяткаваньні на ч.Бахуса.
σύμ-βακχος, ὁ, ἡ, удзел у сьвяткаваньні на ч. Бахуса.
συμ-βάλλω, разам кідаць, кінуць; разам несьці, прынесьці, насіць; злучыцца; спаткацца; параўноўваць; судырыцца; згадзіцца, згаджацца; унесьці свой уклад.
συμβᾰσείω, быць схільным на ўмову. //на панаваць.
συμ-βᾰσῐλεύω, супольна стаяць пры ўладзе, супольσύμβᾰσις, εως, ἡ, умова, усузгодненьне, згода.
συμβᾰτήριος, ον, схільны да згоды, згодны на.
συμ-βῐάζω, прывесьці да сузгоднасьці на дарозе сі- //ламоцы.
συμ-βῐβάζω, зьвесьці разам; прывесьці да згоды; пагадзіць, пагадзіцца.
σύμ-βῐος, ὁ, ἡ, муж, жонка.
συμ-βῐόω, жыць разам.
συμβίωσις, εως, ἡ, сужыцьце, сумеснае жыцьцё.
σύμβλησις, εως, ἡ, тлумачэньне, выклад, паясьнень- //не.
συμβλητός, ή, όν, параўнальны.
συμ-βοάω, прысупольніцца да крыку аднагалосна; галасна крычаць разам.
συμβοηθεία, ἡ, супольная або агульная помач.
συμ-βοηθέω, аказаць супольную службу помачы.
συμβόλαιον, τό, знак; азнака, якая вядзе ад выснаву; сымптом.
συμβόλαιος, α, ον, сьцьверджаны на падставе ўмовы.
συμβολεύω, спажываць добра прыпраўленую страву, е- //жу.
συμβολέω, упасьці разам з.
συμβολή, ἡ, спатканьне; судыраньне; злучэньне, аб'еднаньне; 2. бітва, напад, атака.
συμβολῐκός, ή, όν, сымбалічны.
σύμβολον, τό, сымболь, знак распазнаньня; дакумэнт тоеснасьці; азнака; умова /гандлёвая/.
σύμβολος, ὁ, прадзнака, азнака, омэн.
συμβούλευμα, ατος, τό, дадзеная рада; раджаньне, раеньне; рада.
συμβουλευτικός, ή, όν, раены, дараджаны; прыналеж- //ны да рады.
συμβουλεύω, раіць, радзіць, даваць раду.
συμβουλή, ἡ, рада, раеньне.
συμβουλία, ἡ, = συμβουλή.
συμβούλιον, τό, рада.
συμ-βούλομαι, адначасна а. гэтаксама хацець; зга- //дзіцца.
σύμ-βουλος, ὁ, ἡ, райца, радца.

συμμᾰθητής, ου, ὁ, сябра школьны, таварыш /школьнае лавы/.
συμ-μανθάνω, вучыцца разам з, зусім навучыцца.
συμ-μάρπτω, схватваць разам; агортваць, разумець.
συμ-μαρτῠρέω, съведчыць разам зь іншымі.
συμ-μάρτῠς, ῠρος, ὁ, сусъведка.
συμμαχέω, быць саюзьнікам, разам змагацца.
συμμᾰχία, -ίη, ἡ, ваеннае саюзьніцтва; помач у вайне; саюз, альлілнс.
συμμᾰχικός, ή, όν, датычны альліянсу, саюзу.
συμ-μάχομαι, змагацца ў бою разам.
σύμμᾰχος, ου, ὁ, змаганьне побач /разам/; саюзьнік.
συμ-μελετάω, практыкаваць разам з.
συμ-μένω, аставацца разам, стаяць разам, /у/трымаць.
συμ-μερίζω, -ομαι, выразіць свой удзел зь іншым; атрымаць свой удзел разам зь іншымі.
συμ-μεταβαίνω, адначасна пераходзіць, перайсьці.
συμ-μεταβάλλω, адначасна далучыцца да зьмены, зьінчаньня або замены.
συμ-μετακοσμέομαι, сваю вопратку зьінчыць.
συμ-μεταχειρίζομαι, быць здольным выканаць або аднача сна прыняць кіраўніцтва.
συμ-μετέχω, = συμμερίζω.
συμ-μετίσχω, = συμμετέχω.
συμμέταχος, ον, удзелапрыймальны.
συμμετρέω, вымерваць, вымерыць, вылічыць , прымерыць.
συμμέτρησις, εως, ἡ, адмераньне; вымераньне, вылі-
συμμετρία, ἡ, сымэтрыя, дакладная прапорцыя.//чэньне.
σύμμετρος, ον, сымэтрычны; сувымерны /зь нечым/;датарнаваны да; 2. адыстар, падобны; 3. датарнаваны манераю; /Парм., I40c/.

συμ-μητιάομαι, /па/раіцца зь н.
συμ-μηχᾰνάομαι, старацца зь ін. здабыць, дастаць; імкнуцца зь ін. плянава выканаць.
σύμμῑγα, прысл. зьбянтэжана, разгублена.
συμμῑγής, ές, зьбянтэжаны; зьбіты з тропу.
συμ-μίγνῡμι або -ύω, зьмешвацца з а. у натоўпе; зьлівацца, расьцярушвацца.
συμμικτός, όν, зьмешаны, разнародны.
συμ-μῑμέομαι, аднача сна /ў/насьледаваць, пераймаць; імітаваць, пераймаць.
συμμῑμητης, ου, ὁ, пераймальнік; імітатар.
σύμμιξις, εως, ἡ, зьмяшаньне разам, сумесь; 2. сэк-
σύμ-μολπος, ον, сузгодны. //суальны акт, інтэркорс.
συμ-μολύνω, разам мазаць, пэцкаць, пляміць.
συμμορία, ἡ, кляса падаткаплатнікаў: у Атэнах I200 найболей багатых грамадзян; 2. аддзел /I5 ваданлаваў/ морскае флёты.

σύμ-μορος, ον, суападаткаваны, ап. разам зь іншымі.
συμ-μορφίζω, аднолькава хвармаваць; уаднастайніць, зрабіць адыстарным.
σύμ-μορφος, ον, падобны да постаці, аднахвормны.
συμμορφόω, = συμμοφίζω.
συμ-μοχθέω, цярпець з к.-н. або зносіць нядолю.
συμ-μυέω, пасьвяціць, высьвяціць разам.
συμ-μύω, закрываць рот; закрыцца.
συμπάθεια, ἡ, спагада, спаўчуваньне.
συμπαθέω, спагадаць, спаўчуваць; сымпатызаваць.
συμ-πᾰθής, ές, спагадлівы, чулага сэрца, сымпатычны.
συμπᾰθῶς, прысл. спагадна, чула, сымпатычна.
συμ-παιδεύω, вучыцца разам, вучыць; быць адукаваным.
συμ-παίζω, жартаваць, пацьвяляцца, гуляць.
συμ-παίκτωρ, ορος, ὁ, сябра гульняў, забаваў.
συμ-παίω, зьбіваць разам; біць адно аб адно.
συμ-πᾰνηγῠρίζω, абыходзіць урачыстасьць з к.-н., мець урачыстае зграмаджэньне.
συμ-παραγίγνομαι, адначасна а. гэтаксама прыйсьці, быць прысутным з.
συμ-παραθέω, бегчы разам з.
συμ-παρακᾰλέω, разам а. адначасна прыклікваць.
συμ-παρακομίζω, адначасна і разам з тым весьці; пра вадаплаў: адначасна весьці ўздоўж узьбярэжжа.
συμ-παρακύπτω, завярнуцца разам з.
συμ-παραλαμβάνω, пераняць разам з.
συμ-παραμένω, астацца /прабыць/ разам з а. сярод; адначасна астацца пры жыцьці.
συμ-παρανέω, патакваць /ківаць галавою/ на знак згоды.
συμ-παρανήχομαι, плысьці побач разам.
συμ-παραπέμπω, эскартаваць разам зь іншымі.
συμ-παραπλέω, адначасна прыяжджаць.
συμ-παραπόλλῡμι, зьнішчыць разам з.
συμ-παρασκευάζω, прывесьці разам зь іншымі; прылучыцца да падрыхтовы.
συμ-παραστᾱτέω, стаяць на пагатове а. на стражы.
συμ-παραστάτης, ου, ὁ, помач, падтрымка, гатоўнасьць.
συμ-παρατάσσομαι, зь іншымі а. гэтаксама стануць /уключыцца/ у змагарны парадак /да бітвы/.
συμ-παρατηρέω, назіраць побач зь ін. або разам.
συμ-παραφέρω, пераносіць /выносіць, несьці/ разам зь ін.
συμ-παρεδρεύω, сядзець побач або ўздоўж з.
συμ-πάρειμι, быць прысутным разам з.
συμ-πάρειμι, ісьці разам адначасна.
συμ-παρεισέρχομαι, адначасна зь іншымі пранікаць, прапіхацца або прасьлізгвацца.
συμ-παρέπομαι, ісьці разам з., праводзіць разам.
συμ-παρέχω, адначасна прапанаваць; разам даставаць, здабываць або атрымліваць.

συμ-παρίπταμαι, разам побач лётаць.
συμ-παρίστημι, разам ставіць побач. //ка.
συμ-παρομαρτέω, сьледаваць разам з, праводзіць зблісσύμπᾶς, ᾶσα, ᾶν, усе разам, усё ў вадным; цэласьць разам; увесь, агульны, цэлы, суцэльны; [Пол, VIII, 546с].
συμ-πάσχω, спаўчуваць, разам цярпець, разам адчуваць боль.
συμ-πᾰτάσσω, разам удырыць, разам біцца.
συμ-πᾰτέω, разам падступаць.
συμ-πατριώτης, ου, ὁ, суродзіч, супатрыёт.
συμ-πεδάω, злучаць разам, сцаляць, зьвязваць.
συμ-πείθω, пераконваць разам, лучыцца ў перакананьні; быць перакананым.
σύμ-πειρος, ον, абазнаны з. //лаць.
συμ-πέμπω, высылаць разам або з; адначасна адсыσύμ-πεντε, пяць разоў.
συμ-περαίνω, завяршаць або выконваць разам.
συμ-πέρθω, нішчыць з; памагаць нішчыць.
συμ-περιάγω, вадзіць, весьці навакол а. разам.
συμ-περιλαμβάνω, адначасна абдымаць, агарнуць, вы-
συμ-περινοστέω, разам спацыраваць або //канаць. хадзіць туды і сюды; падарожнічаць навакол з.
συμ-περιστρέφω, круціцца навакол зь н. //кол з.
συμ-περιφέρω, насіць навакол з; быць ношаным нава-
συμ-πέσσω, памагаць у варцы; стравіць суцэльна.
συμ-πήγνῡμι, укладваць дакладна, датарнаваць; выканаць, зрабіць акуратна.
σύμ-πηκτος, ον, дакладна зложаны, ухвармаваны.
συμ-πιέζω, уціскаць, сьціскаць разам; ухваціць да-
συμ-πίνω, піць з к.-н., піць. //кладна.
συμ-πίπτω, разам падаць; разам завальвацца; разам спатыкацца; судырыцца; здарацца.
συμ-πίτνω, = συμπίπτω. //зьі: тварыць.
συμ-πλάσσω, хвармаваць, вырабляць разам у; у паз-
συμ-πλᾰτᾰγέω, разам пляскаць або біць.
συμ-πλάττω, = συμπλάσσω.
σύμπλεκτος, ον, скручаны, зьвіты, сьплецены.
συμ-πλέκω, разам плесьці, сьплесьці; разам зьвіваць; разам зьвязваць, прышчэплiваць, прышпільваць ці прыколваць; умяшчацца, абдымацца, ахапляцца ў абдым-
συμ-πλέω, разам плысьці на моры ў вадаплаве; //ках. разам адбываць падарожжа.
σύμ-πλεως, ων, зусім поўны.
συμ-πληγάς, ᾰδος, адначаснае судыраньне.
συμ-πληθύνω, множыць разам.
συμ-πληθύω, = συμπληρόω.
συμ-πληρόω, разам напаўняць /грузіць/ вадаплаў: абсадзіць людзьмі; зусім напоўніць; зрабіць дастатковым для падарожжа; напоўніцца.

συμποκή, ῆς, ἡ, съпляценьне; павязаньне /дачыненьняў/; абдымкі; змаганьне, змаганьне на рынгу.
σύμπλοος, -πλους, ὁ, ἡ, спадарожнік вадаплаву; спадарожнік, -ца; удзельнік, -ца.
συμ-πνέω, разам уздыхаць або дыхаць; быць аднадумным; трымацца разам; умяшацца ў.
συμ-ποδέζω, зьвязваць ногі разам; спутваць рукі і ногі; быць уцягнутым у /справу/.
συμ-ποιέω, з к.-н. разам рабіць або памагаць н.
συμ-λολεμέω, разам змагацца, успамагаць у вайне.
συμ-πολῖτέω, быць грамадзянінам таго самага або дадзенага гаспадарства; быць суродзічам.
συμ-πολίτης, ου, ὁ, суграмадзянін, суродзіч.
συμ-πομπεύω, браць удзел у працэсьі, у ходзе.
συμ-πονέω, натужвацца; мець аднолькавы клопат, цярпеньне або працу; памагаць, памагчы.
συμ-πορεύομαι, суспадарожнічаць, разам ісьці, разам маршыраваць, крочыць: разам спацыраваць.
συμ-πορθέω, разам разбурваць, ніпчыць.
συμ-πορίζω, зграмадзіць разам, зграмаджваць; разам //атрымліваць.
συμποσία, ἡ, = συμπόσιον.
συμποσίαρχος, ὁ, сымпозыярх, загадчык на банкеце.
συμπόσιον, τό, сымпозыён; сумесная выпіўка; банкет, баляваньне спалучанае з дыскусыяй, музыкаю, танцамі; Συμπόσιον, тытул аднаго з Плятонавых дыялёгаў.
συμπότης, ου, ὁ, удзельнік сымпозыёну.
συμποτικός, ἡ, όν, свомы для выпіўкі, сымпозыёну.
συμ-πράκτωρ, ορος, ὁ, памочнік, чаляднік.
σύμπρᾶξις, εως, ἡ, супраца, супольнае дзеяньне; помач, памаганьне, самапомач.
συμ-πράσσω, = -ττω, з к.-н. займацца, тварыць /працаю/; весьці самапомач; патрымлівацца ўзаемна; падтрым//ліваць.
συμπρεσβευτήρ, οῦ, ὁ, сувысланец, супасол.
συμ-πρεσβεύω, быць супасланцом /адным з паслоў/.
σύμ-πρσβυς, εως, ὁ, сувысланец, сябра-пасол.
συμ-πρεσβύτερος, ὁ, сустаршыня; калега-прэзбітар, сябра-прэзбітар.
συμ-πρήκτωρ, ορος, ὁ, = συμπράκτωρ.
συμ-πρήσσω, = συμπράσσω.
συμ-προθῦμέομαι, мець аднолькавае стараньне або аднолькавую ахвочасьць, руплівасьць.
συμ-προξενέω, /да/памагаць сродкамі абесьпячэньня.
συμ-προπέμπω, праводзіць разам зь ін.; далучыцца да саправаджэньня.
σύμπτυκος, ον, зложаны разам.
συμ-πτύσσω, складваць разам.
σύμπτωμα, ατος, τό, сымптом; здарэньне; выяў нейкага зьявішча або здарэньня.

σύμ-πυκνος, ον, съціснуты.

συμφερτός, ή, όν, сузграмаджаны, аб'еднаны, злучаны, супольны, зьвязаны.

συμφέρω, зыйсьціся разам; сузграмадзіцца; датарнавацца; далучыцца ў вабароне; быць карысным; згадзіцца; быць сьведамым/у дадзеным прадмеце/; здарыцца; дазнаць /шчасьця, але пераважна гора/; выпасьці на долю; спаткацца.

συμφεύγω, уцякаць разам з; быць выгнаным /з краю/; быць на выгнаньні з.

σύμφημι, згаджацца, зацьвердзіць, пастанаўляць, прыняць пастанову; падаць голас /за, сказаць але, так/.

συμ-φθέγγομαι, зграцца, настроіцца з, быць у акордзе.

συμ-φθείρω, зруйнаваць дашчэнту, згладзіць да зямлі.

συμ-φθίνω, шчэзнуць, прапасьці разам з.

σύμ-φθογγος, ον, сугучны.

συμ-φιλέω, любіць узаемна, злучыцца ў любові.

συμ-φλέγω, разам падпаліць, спаліць дашчэнту.

συμ-φιλοσοφέω, вывучаць філязофію з к.-н. або разам.

συμ-φοβέω, /с/палохацца разам.

συμ-φοιτάω, ісьці а. хадзіць часта разам /у школу/.

συμφοίτησις, ή, ходжаньне разам ў школу.

συμφοιτητής, οῦ, ὁ, школьны сябра.

συμ-φονεύω, забіць разам зь н.

συμ-φορά, ή, зборка, сузграмаджаньне; здарэньне, выпадак; непаводжаньне, няшчасьце, нядоля; добрая доля; шчасьлівы выпадак.

συμφορέω, сабіраць у гурбу; згрэбваць, зграбсьці.

συμφόρησις, εως, ή, напор людзей, цяснота, таўкатня, натоўп, маса.

συμφόρως, прысл. выгадна, карысна.

συμφράδμων, ονος, ὁ, сурайца, судараднік.

συμ-φράζομαι, /па/раіцца з к.-н.

συμ-φράσσω, ушчыльняць, ушчыльніць, туга зашпахлявацць; сьвістаць, сьвіснуць разам.

συμ-φρονέω, узгодніцца, згадзіцца з к.-.н.

συμ-φροντίζω, сумесна заапекавацца к.-н.

σύμ-φρων, ον, аднадумны, згодны, зычлівы, брацкі.

συμ-φυγάς, άδος, ὁ, сувыгнанец.

συμ-φυής, ές, цесназрослы, спарышавы, цесназьвязаны, скованы.

συμφύλαξ, ᾶκας, ὁ, сустарожжа, сябра-старожжа.

συμ-φύλασσω, трымаць стражу з к.-н. або разам.

συμ-φυλέτης, ου, ὁ, суродзіч.

σύμ-φῦλος, ον, суродны, зроднены, сваяцкі.

σύμφυρτος, ον, зьмешаны, зьмешаны разам.

συμ-φύρω, мяшаць разам, мясіць.

συμ-φυτεύω, зафлянсоўваць, зафлянсаваць, прышчапіць, ушчапіць.

σύμφυτος, ον, разам зрослы, спарышаваты.

συμ-φύω, успамагаць супольны рост; успамагаць су-

польнасьць у росьце; рабіць рост супольным; расьці разам; вырасьці ў вадно.
συμ-φωνέω, згаджацца ў голасе; быць у сузгоднась-ці а. ў гармоніі /унісон/; прыйсьці да сузгоднасьці з.
συμφώνησις, ἡ, сугучанасьць, сузгоднасьць галасоў.
συμφωνία, ἡ, сымфонія, унісон галасоў а. ў строю музычнага інструмэнту; 2. гармонія.
σύμφωνος, ον, сузгодны ў голасе; гарманійны; у уні-сон; сяброўскі; [Пол. X, 617b].
συμψάω, датыкаць адзін аднаго.
συμ-ψεύδομαι, разам хлусіць, сумесна зманьваць.
συμ-ψηφίζω, разам рахаваць, лічыць; усузгодніць.
σύμ-ψυχος, ον, аднадушны, сузгодны.
σύν і ξύν, 1. прысл: разам, супольна, адначасна, праз, гэтаксама, апрача таго, да гэтага, апрача гэтага; 2. прыназ: з, разам, супольна, побач, апрача, гэтак-сама; 3. прыстаўка: адказвае беларускаму су: су+поль-на; су+працоўнік, су+родзіч, су+жыцьцё.//ным да н.
συν-ἀγανακτέω, быць зьнеахвочаным а. быць упярэджа-
συν-άγγελος, ὁ, супасланец.
συν-ἀγείρω, сузграмадзіць, зграмадзіць.
συν-ἀγελάζω, далучыцца да гурту а. стада.
συν-αγῖνέω, зграмадзіць разам.
συν-αγκεία, ἡ, = μισαγκεία.
συν-άγνῡμι, разьбіваць на кавалкі; распырскваць.
συν-αγορεύω, гаварыць з к.- н., далучыцца да рады.
συν-αγρεύω, далучыцца да гонкі /зьвера/.
συνάγχη, ἡ, запаленьне горла.
συν-άγω, прыводзіць разам; /з/грамадзіць.
συνἄγωγεύς, έως, ὁ, зьбіральнік, склікальнік, злу-чальнік; 2. падганяльнік; 3. старшыня сынаґоґі.
συνἄγωγή, ἡ, сходжаньне разам, сход, зграмаджэньне, задзіночаньне;месца зграмаджэньня; сынаґоґа, школа.
συνἄγωγός, ον, злучаны, скліканы.
συν-ἄγωνιάω, адначасна быць у страху.
συν-ἄγωνίζομαι, разам змагацца; браць удзел у біт-ве; 2. супрацоўнічаць, супрацаваць, падтрымліваць.
συνἄγωνιστής, οῦ, ὁ, сузмагар, сябра, таварыш у бітве; памочнік. //зь іх.
συν-άδελφος, ον, які мае сястру, брата а. некалькі
συν-ἄδῐκέω, чыніць несправядлівасьць; прыймаць у-дзел у акце несправядлівасьці.
συν-ᾴδω, пяяць разам; згарманізаваць, - цца.
συν-αείρω, случваць у ярме.
συν-ᾱείρω, паэт. = συναίρω.
συν-αθλέω, = συναγωνίζομαι.
συν-ἀθροίζω, адначасна сузграмадзіцца, грамадзіцца.
συν-αθύρω, гуляць; забаўляцца.
συν-αιθριάζω, падбухторваць; падбухторвацца.

σύν-αιμος, ον, сурoдны, супольнае крыві; – ὁ, ἡ, апякун сям'і /Ζεύς/; сваяк, брат, сястра.
συναίμων, ονος, ὁ, ἡ, = σύναιμος.
συν-αινέω, злучыцца ў выражэньні ўзнаньня; узнаць, прызнаць, падтрымліваць, падтакваць.
συν-αίνῦμαι, разам браць, узяць, трымаць.
συν-αίρω, паэт. συναείρω, лучыць; падняць, узьняць а. забраць разам; памагаць; лучыцца зь ін.
συν-αισθάνομαι, пераймацца а. адчуваць разам.
συν-αίτιος, ον, сувінаваты, супольна вінаваты; -ὁ, ἡ, суудзельнік, -ца.
συν-αιχμάζω, змагацца разам з.
συν-αιχμάλωτος, ὁ, сябра-нявольнік, сунявольнік.
συν-αιωρέομαι, быць трыманым у зьняволені з к.-н. або ў нерашучасьці.
συν-ακράζω, цьвісьці, стаяць у цьвеце.
συν-ἀκολουθέω, сьледаваць разам за; сьледаваць, ісьці духова, разумець.
συν-ἀκοντίζω, кідаць кап'ём разам або ў тым самым часе. //аднаго.
συν-ἀκούω, чуць разам з або адначасна; чуць адзін
συνακτικός, ἡ, όν, здольны прыносіць разам.
συν-ἀλἄλάζω, разам голасна крычаць.
συν-αλγέω, спаўчуваць у цярпеньні або ў бядзе; быць спагадным /спагадлівым/.
συν-ᾱλίζω, зьбіраць разам; 2. прыйсьці разам або зыйсьціся; спаткацца. //лёс, доля.
συναλλάγή, ἡ, вымена, замена, зьмена, зьіначаньне;
συνάλλαγμα, ατος, τό, узаемная ўмова, кантракт; паразумленьне.
συν-αλλάσσω, = -ττω, абменьвацца адзін з адным; прыйсьці да аб'еднаньня а. паразумленьня; гадзіцца; злучыцца; дамовіцца.
συν-ἁμᾰ, = συνάμᾱ, прысл. разам, усё разам.
σύναμμα, τό, вузёл; зьвяз, зьвязаньне.
συναμφότερος, α, ον, абодва разам; случаны з к.-н.; узьніклы з двух; абодва адначасна; аднолькавы.
συν-αναβαίνω, ісьці а. ўзыходзіць разам.
συν-αναβοάω, адначасна з к.-н. крычаць.
συν-ἀναγιγνώσκω, разам чытаць, пазнаваць.
συν-ἀναγκάζω, разам ці адначасна зь н. вымушаць.
συν-αναιρέω, з к.-н. адначасна нішчыць або забіваць.
συν-ανακεῖμαι, узьлежваць разам пры стале. //лом.
συν-ανακλίνομαι, пакласьціся разам; узьлегчы за ста-
συν-ἀνᾱλίσκω, зужыць разам; раскідацца /грашыма/; дзяліць кошты зь ін.
συν-αναπαύομαι, супачываць, супачыць разам.
συν-αναπείθω, далучыцца ў пераконваньні.

συν-αναπέμπω, высылаць, выслаць разам. //мі.
συν-αναστρέφω, абыходзіцца з к.-н.; сужыцца зь людзь-
συναναστροφή, сужыцца з к.-н.; абыходзіцца з к.-н.
συν-ανατρέχω, бегчы з к.-.н, бегчы на перагонках.
συν-αναχορεύω, танцаваць у хараводзе; парушацца з
συν-αναχωρέω, назад ісьці з. //хорам.
συν-αντάω, і -έω, сустрэцца тварам у твар; выйсьці
συνάντησις, εως, ἡ, сустрэча. //на сустрэчу.
συν-αντιάζω, = συναντάω.
συν-αντλέω, з к.- н. стойка вытрываць, выцерпець.
συν-άτομαι, = συναντάω,
συν-ἀνύ/τ/ω, прыходзіць, прыйсьці да канца з н.
συν-ἀοιδός, όν, = συνῳδός.
συν-ἄορος, ον, = συνήορος.
συν-απάγω, весьці назад з; быць адведзеным разам з.
συν-ἅπᾶς, = σύμπᾶς.
συν-ἄπειμι, выходзіць, выйсьці разам з.
συν-απεργάζομαι, садзейнічаць; /да/памагаць у вы-
канчэньні, выкананьні або завяршэньні.
συν-απίστημαι, = συναφίστημαι.
συν-αποβαίνω, выходзіць разам з к.-н.
συν-αποθνήσκω, паміраць, памерці разам з.
συν-αποκάμνω, быць змучаным або вычарпаным. //н.
συν-απολαμβάνω, адначасна прымаць, прыняць ад к.-
συν-απολάμπω, адначасна засьвяціць або запаліць
